№ 7 (509) 2 сакавіка 2007 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы

# З працягнутай рукой

22 лютага стала вядома, што ўрад А.Лукашэнкі зьвярнуўся да Расеі з просьбай аб выдзяленьні гіганцкага стабілізацыйнага крэдыту. 1,5 мільярда даляраў патрэбныя яму для пераадоленьня наступстваў павышэньня цэнаў на энэрганосьбіты. У аўторак 27 лютага газэта «Ведомости» першай паведаміла, а іншыя расейскія СМІ падхапілі інфармацыю, што Міністэрства эканомікі Беларусі распрацавала плян прыватызацыі найбуйнейшых прадпрыемстваў краіны, у тым ліку «Нафтану», Мазырскага НПЗ, ТАА «Палімір», «Белшыны», гарадзенскага «Азоту», «Белтэлекаму», тытунёвай фабрыкі «Нёман», цэмэнтавых заводаў, цукраварняў, бровараў і віна-гарэлачных заводаў. **Старонка 3.** Мілінкевіч: «Гэта яшчэ больш закабаліць нашу дзяржаву». Булгакаў: «Рост спажываньня любым коштам». **Старонка 4.** «Ведомости»: Беларусь пачынае стандартныя эканамічныя рэформы. **Старонка 5.**

## У НУМАРЫ

### Бел-чырвона-белы і чырвона-зялёны побач

Дыскусія вакол адной з налепак да Дня Волі. **Старонка 6.**

### Зьяўленьне пустаты народу

Не спрабаваць выкарыстаць момант у беларуска-расейскіх адносінах на карысьць незалежнасьці было б памылкай. Піша Віталь Тарас. **Старонка 8.**

### Хаім Суцін і Сьмілавічы

У траўні ў Сьмілавічах плянуюць адкрыць музэй Хаіма Суціна. Ягонае палатно прададзенае за рэкордны кошт. На ягонай радзіме спалілі мусульманскую сьвятыню. **Старонка 26.**

### Чалавечае і хрысьціянскае

Онлайн-канфэрэнцыя зь Пётрам Рудкоўскім. **Старонка 22.**




## Рок-каранацыя ў здымках

Старонкі 18—20.

ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# У нумары

## люстра дзён

Усё дзеля крэдыту ......... 3
З працягнутай рукой ...... 4
Булгакаў: «Рост спажываньня любым коштам» ........................... 4
Мілінкевіч: «Гэта яшчэ больш закабаліць нашу дзяржаву» ......................... 4
Аглядальнік «Белорусов и рынка»: 1,5 мільярда — гэта ж няшмат ........... 4
Ведомости: Беларусь пачынае стандартныя эканамічныя рэформы ... 5
Бел-чырвона-белы і чырвона-зялёны побач ................................ 6
Цесна сядзелі ды добра гаварылі ........................... 21

## камэнтары

Віталь Тарас. Зьяўленьне пустаты народу ................ 8
Павал Абрамовіч. Пазбавіцца комплексаў25

## з усіх старон

Масква... Як мала ў гэтым гуку .................................... 10
У пекле Азіі .................... 14

## культура

Ствараецца музэй Манюшкі ......................... 12
Гены пальцам не затыкнеш ........................ 13
Каляндар на сакавік ..... 25
Тры весткі пра Суціна і Сьмілавічы .................... 26

## комікс

Бульбmana падставілі ........................ 16

## мы самі

Вялікі дзякуй за ахвяраваньні ............. 17

## музыка

Рок-каранацыя ў здымках ....................... 18
Каранацыя застаецца маштабнаю і незалежнаю ................. 19

## гутарка

Чалавечае і хрысьціянскае: онляйн-канфэрэнцыя зь Пётрам Рудкоўскім . 22

## год паэзіі

Андрусь Храпавіцкі. Студэнты і pogo ............ 28
Mann Kurt. Сармацкія хайку ................................ 28
Мікалай Петрушэнка. Бліз гасьцінца у вёсцы Ляўкова... ....................... 28

## дзе варта быць

Бабілёнская вежа, Зьміцер Вайцюшкевіч, Алесь Лагвінец, ТТ-34... ........ 30

## калі б...

...беларусы былі пацукамі ........................... 31

# Міжнародная прэмія «Нашай Ніве»

«Наша Ніва» – ляўрэат прэміі імя Буцэрыюса фундацыі «Zeit». Гэта прызнаньне справы, якую робіць Рэдакцыя і кожны з Вас, шаноўныя чытачы.

Прэмія фонду «Zeit» — штогадовая ўзнагарода, што прысуджаецца журналістам і СМІ з Расеі, Беларусі, Украіны, Грузіі і Паўночнага Каўказу, якія выступаюць за свабоду слова і грамадзянскай супольнасьці. Прэмія заснаваная ў 2000 г. у гонар юрыста, журналіста і выдаўца Герда Буцэрыюса. З 2004 г. фонд выдае прэмію супольна з нарвэскай фундацыяй «Fritt Ord» (Свабоднае слова) (Осла).

У мінулыя гады прэмію фундацыі «Zeit» атрымлівалі беларускія газэты «Народная воля», «Витебский курьер», «Салідарнасць», інфармагенцыя БелаПАН, журналісты Мікола Маркевіч, Сьвятлана Калінкіна ды інш.

Прэмія будзе ўручаная 21 чэрвеня ў Нобэлеўскім інстытуце ў Осла.

**Ул. інф.**

## КАМЭНТАР РЭДАКЦЫІ

# Трэба мірыцца

У сваіх унутраных спрэчках дэмакратычная апазыцыя падышла да небясьпечнай рысы.

З высьвятленьня вагі асобных палітыкаў палеміка перайшла ў сьветапоглядную галіну, з асобаў — на пробы партыйнае вагі, загаварылі найстрашнейшыя перажыткі каляніялізму, расейскамоўныя пачалі брацца на беларускамоўных і наадварот. Голасам стрыманасьці мусілі б прамаўляць інтэлектуалы, але, на жаль, і частку іх захапілі партыйныя прыналежнасьці; старыя крыўды адных, даўнія фанабэрыі другіх абудзіліся, падбіваючы да падрахункаў і рэваншу, падрываючы адзінства прыхільнікаў дэмакратыі і эўрапейскага выбару.

Незаўважна пад пагрозай руйнаваньня аказалася ўсё тое, што напрацоўвалася цэлыя гады й дазваляла захоўваць прыцягальнай, жыцьцяздольнай і неперарыўнай дэмакратычную альтэрнатыву.

Ня можна разбураць фундамэнтаў адзінства незалежнага грамадзтва. Ад гэтага зьменшацца шанцы Беларусі на ператварэньне ў дэмакратычную, скансалідаваную цэнтральнаэўрапейскую дзяржаву і надаўжэй зацягнецца перабываньне яе ў постсавецкім стане.

Ня варта казаць: усе вінаватыя патрошку. Мера віны ў кожнага свая. На сайце адной з партый за тыдзень зьявілася дзесяць пафмлетаў на адрас палітыка, за якога самі партыйцы надоечы агітавалі. На другім інтэрнэт-сайце назвалі «Нашу Ніву», і ўвогуле ўсю нацыянальную культуру, «нацыянальнай лавачкай»... Пакуль будзе захоўвацца культурны расізм, пакуль палітычныя дзеячы і інтэлектуалы будуць дазваляць сабе спэкуляцыі на нацыянальным пытаньні, нічога зь Беларусі ня будзе.

Успышкі нематываваных ці другаснаматываваных палемік апошняга часу, на нашу думку, высьвецілі, наколькі крохкае яшчэ адзінства і наколькі важна ўнікаць канфліктаў па непрынцыповым. Нашто ж усе гэтыя сваркі і звадкі, калі ўсе мы разам ляцім да зор? — калісьці пісаў Максім Багдановіч.

Палітыкам жадаем знайсьці ўзаемавыгадны кампраміс у непрынцыповых пытаньнях.

Заклікаем да стрыманасьці аўтараў кола «Нашай Нівы», «ARCHE» і ўсіх іншых выданьняў.

Як бацькі ня маюць права ўцягваць дзяцей у свае канфлікты, так ня можна ў запале палітычных палемік ставіць пад сумнеў фундамэнтальныя прынцыпы незалежнага грамадзтва.

# Усё дзеля крэдыту

Сідорскі пацьвердзіў гатоўнасьць да прыватызацыі буйных прадпрыемстваў.

«Дзяржава гатовая прадаваць сваю долю ў буйных прадпрыемствах, аднак толькі за іх рэальны кошт», — заявіў ён журналістам у сераду.

Ён сказаў, што будзе разглядацца пытаньне продажу «Белшыны». Паводле ягоных словаў, «Белшына» будзе каштаваць больш за 1 млрд даляраў.

Ён таксама згадаў у кантэксьце прыватызацыі нафтаперапрацоўчыя заводы, заявіўшы, што іх кошт ня можа быць нізкім.

На пакупку «Белшыны» яшчэ сем гадоў таму заяўлялі прэтэнзіі расейскія фінансава-прамысловыя групы, зьвязаныя з былым сьпікерам Дзяржаўнай думы Генадзем Селязьнёвым — асабістым сябрам А. Лукашэнкі, які ня раз падтрымліваў кіраўніка Беларусі ў часе выбарчых кампаніяў.




**«Белшына» ацэненая на мільярд даляраў.**

Варта адзначыць, што інфармацыя аб плянах маштабнай прыватызацыі найбольшых прадпрыемстваў Беларусі ўпершыню зьявілася не ў беларускіх крыніцах, а ў расейскай прэсе некалькі дзён таму. Гэта паказвае, што «выцек» мог быць сплянаваным. Зьяўленьне гэтай інфармацыі супадае з просьбай беларускага ўраду да Расеі аб беспрацэнтавым крэдыце гіганцкім памерам 1,5 млрд даляраў. Такія крэдыты звычайна выдаюцца пад нейкія палітычныя ці эканамічныя саступкі.

У беларускім выпадку просьба аб крэдыце выглядала як прапанова застацца ў зоне ўплыву Расеі і не ўваходзіць у Балта-Чарнаморскі энэргакалектар, аб якім мараць Літва і Украіна.

Гучныя просьбы беларускага кіраўніцтва аб крэдытаваньні нашай краіны «Райфайзэнбанкам» (на мільярд даляраў) і Кітаем (на 1,2 млрд) прагучалі амаль адначасова, але не былі ўспрынятыя назіральнікамі як рэалістычныя.

Эканамічная сытуацыя ў Беларусі нязначна пагоршылася пасьля 1 студзеня ў сувязі з ростам цэнаў на энэрганосьбіты. Так, індэкс цэнаў на прадукцыю прамысловага прызначэньня вырас за студзень на 16%. Сярэдні заробак апусьціўся ніжэй за ўзровень кастрычніка 2006 году (да 288 даляраў). У сувязі зь інфляцыйнымі чаканьнямі для ўтрыманьня курсу рубля Нацбанку прыйшлося спрадаць частку валютных запасаў, і яны ўпершыню за доўгі час зьнізіліся.

Між тым Беларусь усё яшчэ атрымлівае паліва па найніжэйшых цэнах у рэгіёне.

Кіраўніцтва Беларусі баіцца, што спыненьне росту спажываньня падарве яго папулярнасьць. Адсюль і просьба аб гіганцкім крэдыце.

Абяцанкамі прыватызацыі ласых кавалкаў беларускай эканомікі Беларусь карміла Расею прынамсі ад 2001 году. Ад часу, калі Масква перастала задавальняцца палітычнай дамінацыяй над Беларусьсю і палітыкай русіфікацыі, якая тутака праводзіцца, і стала патрабаваць кантролю і над беларускай гаспадаркай.

У панядзелак газэта «Ведомости» першай паведаміла, а іншыя расейскія СМІ падхапілі інфармацыю, што Міністэрства эканомікі Беларусі распрацавала плян прыватызацыі найбуйнейшых прадпрыемстваў краіны, у тым ліку «Нафтану», Мазырскага НПЗ, ТАА «Палімір», «Белшыны», гарадзенскага «Азоту», «Белтэлекаму», тытунёвай фабрыкі «Нёман», цэмэнтавых заводаў, цукраварняў, бровараў і вінна-гарэлачных заводаў.

Намесьнік міністра эканомікі Алег Мельнікаў у аўторак камэнтаваў пляны маштабнае прыватызацыі нацыянальнае маёмасьці вельмі ўхіліста. «Плян мерапрыемстваў па стабілізацыі сытуацыі на ўнутраным валютным рынку і дасягненьні дадатнага сальда зьнешняга гандлю Беларусі на 2007 год уяўляе сабой папярэднія накіды, — цытуе ягоныя словы дзяржаўнае агенцтва БелТА. — Гэты плян будзе разглядацца ўрадам у адпаведнасьці зь дзеючым заканадаўствам. Тады будзе прымацца адпаведнае рашэньне». Што датычыцца часткі продажу актываў дзяржавы ў шэрагу найбуйнейшых прадпрыемстваў, то «аб гэтым пакуль што рана гаварыць, — лічыць намесьнік міністра эканомікі. — Але ў прынцыпе гэта нармальны працэс... дзеля павышэньня эфэктыўнасьці дзейнасьці прадпрыемстваў і ў цэлым галіны».

Няпэўнасьць міністра эканомікі ясная. Па-першае, ня ўрад будзе распараджацца прыватызацыяй у нашай краіне. Па-другое, паводле нашай інфармацыі, у кіраўніцтве краіны пакуль няма пэўнасьці, якую канцэпцыю далейшага разьвіцьця эканомікі абраць. Існуюць прапановы структураў Адміністрацыі прэзыдэнта, Рады бясьпекі, Міністэрства замежных справаў, Міністэрства эканомікі, яны розныя, а прымаць рашэньне будзе асабіста кіраўнік дзяржавы ў вузкім коле сваіх блізкіх і памочнікаў. Па-трэцяе, сыстэма ўлады ў краіне закрытая ня толькі для грамадзянаў, але і для чыноўнікаў сярэдняга рангу, якія толькі здагадваюцца аб мэханізме прыняцця рашэньняў нават у сфэры іх кампэтэнцыі. Па-чацьвертае, беларускія чыноўнікі на ўласнай скуры ведаюць, як небясьпечна ўлазіць са сваімі думкамі ў гульні, распачатыя на самым высокім узроўні.

**Мікола Бугай**

# З працягнутай рукой

Урад А.Лукашэнкі зьвярнуўся да Расеі з просьбай аб выдзяленьні гіганцкага крэдыту для стабілізацыі эканамічнага становішча. Просяць 1.5 мільярда даляраў беспрацэнтава.

Аб гэтым паведамілі карэспандэнту БелТА ў Міністэрстве фінансаў Беларусі. У Мінфіне растлумачылі, што адпаведнае рашэньне было абумоўлена неабходнасьцю дадатковага фінансаваньня выдаткаў бюджэту, выкліканых павышэньнем цэнаў на энерганосьбіты.

«Лічу, што такая просьба мае права на існаваньне. Мы абмяркоўвалі магчымасьць, што ў разе патрэбы ўрад Расеі гатовы разгледзець такі варыянт», — так пракамэнтаваў учора просьбу Беларусі міністар эканамічнага разьвіцьця Расеі Герман Грэф. Тэрміны і сума крэдыту, заявіў ён, будуць прадметам перамоваў.

На пачатак 2007 году замежны дзяржаўны доўг Беларусі склаў 840 мільёнаў даляраў пры прадугледжаным бюджэтам ліміце 2 мільярды даляраў.

Крэдыт на $1,5 млрд быў бы беспрэцэдэнтным для Беларусі. Гэта $155 на кожнага жыхара нашай краіны, зь немаўлятамі ўключна, або больш за тры сотні даляраў на кожнага працаздольнага беларуса.

Просьба аб такім крэдыце азначае, што ўрад сутыкнуўся зь непераадольнымі цяжкасьцямі з напаўненьнем бюджэту.

Варта адзначыць, што цэны на энерганосьбіты пры гэтым застаюцца для Беларусі найніжэйшымі сярод краінаў рэгіёну, але маюць далей расьці наступныя гады. Узамен за льготныя цэны на газ і нафту Беларусь усе апошнія гады знаходзілася ў васальнай залежнасьці ад Расеі і праводзіла палітыку русіфікацыі і канфрантацыі з Захадам.

Зварот да Расеі, якую ўсе апошнія месяцы беларуская прапаганда абвінавачвала ва ўсіх грахах, азначае яшчэ й правал спробаў знайсьці крэдытныя рэсурсы ў дастатковым памеры ў банках Эўропы й Кітаю. Заявы пра магчымасьць атрыманьня крэдытаў з альтэрнатыўных Расеі крыніцаў разглядаюцца незалежнымі экспэртамі як дадатковы спосаб ціску на Маскву.

Ня выключана, што ўзамен за крэдыт краіне прыйдзецца пайсьці на чарговыя


KOMMERSANT.COM

эканамічныя і палітычныя саступкі Расеі. Нагадаем, што ўзгадненьне зьніжаных цэнаў на нафту Масква абумовіла саступкамі Беларусі па сарака іншых таварных пазыцыях. У выніку ў цяжкім становішчы аказаліся беларускія цукраварні, бровары, мясаперапрацоўка, а самае галоўнае — беларускія тавары выціскаюцца расейскімі з розьнічнага гандлю ў самой Беларусі. У доўгатэрміновай пэрспэктыве гэта можа аказацца для беларускай эканомікі больш забойча за дарагоўлю паліва.

## Булгакаў: Рост спажываньня любым коштам

«А. Лукашэнку прасьцей узяць крэдыты, чым урэзаць бюджэт. Гэта праява папулізму. Уразаньне бюджэту, прызнаньне рэальнага эканамічнага стану краіны пахіснула б уяўленьне пра няўхільны рост дабрабыту насельніцтва. За гэтым можна бачыць няўпэўненасьць у сваёй палітычнай будучыні і цьвярозае ўсьведамленьне факту, што толькі рост спажываньня прадухіляе беларускую палітычную сыстэму ад збояў і выбуху. Гіганцкі памер запыту сьведчыць аб тым, што Лукашэнка, найхутчэй што, верыць, што гэта часовая мера, і іранская ды вэнэсуэльская нафта праз пару гадоў выправяць сытуацыю».

## Мілінкевіч: «Гэта яшчэ больш закабаліць нашу дзяржаву»

«Рыторыка А. Лукашэнкі на адрас Масквы, як і гучныя выказваньні міністраў пра «нязначнае падвышэньне» камунальных плацяжоў, былі выключна палітычнай гульнёй і падманам грамадзян.

Улады разумеюць, што ў руках Масквы знаходзяцца эканамічныя рычагі ціску на Беларусь, якія пры пэўным выкарыстаньні могуць прывесьці да дэстабілізацыі грамадзка-палітычнай сытуацыі ў краіне.

Прапановы Захаду дапамагчы ў вырашэньні эканамічных праблем Беларусі пакуль не знаходзяць водгуку ў кіраўніцтва краіны. У гэтай сытуацыі застаецца ім адно — зноў ехаць на паклон у Маскву.

Расійскі стабілізацыйны крэдыт не ўратуе сытуацыі, а яшчэ больш закабаліць нашу дзяржаву і наш народ. Без рэфармаваньня эканомікі і палітычнай сыстэмы, дывэрсыфікацыі паставак энерганосьбітаў, адкрыцьця шляху да новых тэхналёгій мы будзем заставацца ў аўтсайдэрах цывілізаванага сьвету».

## Аглядальнік «Белорусов и рынка»: 1,5 мільярда — гэта ж няшмат

Камэнтуе эканамічны аглядальнік газэты «Белорусы и рынок» **Уладзімер Тарасаў**.

«Міністэрства фінансаў ясна патлумачыла прычыны неабходнасьці атрыманьня такога крэдыту — ліквідацыя наступстваў падаражаньня энерганосьбітаў. Вядома, эканоміка адчула гэтае падаражаньне, бо ў бюджэт не былі ўключаныя такія выдаткі. Таму атрыманьне крэдыту на гэтыя мэты — цалкам нармальны ход, каб эканоміка магла працаваць у нармальным рэжыме, каб пазьбегнуць згортваньня важных інвэстыцыйных праектаў. Іншая рэч, як будуць расходавацца гэтыя грошы, на якія мэты. Тут, лічу, таксама ня варта лішне палохацца: запазычанасьць нашай краіны не такая ўжо й вялікая, улічваючы сусьветны вопыт».

**Запісаў Сямён Печанко**

# Ведомости: Беларусь пачынае стандартныя эканамічныя рэформы

Навагодні нафтагазавы канфлікт з Расеяй можа каштаваць Лукашэнку многа больш, чым проста бюджэтны дэфіцыт. Мінэканомікі падрыхтавала шырокую праграму прыватызацыі дзяржпрадпрыемстваў, па некаторых вядуцца перамовы з інвэстарамі. Беларусь рыхтуецца да значных міжнародных пазык. Гэта можа пакончыць зь цяперашняй эканамічнай мадэльлю краіны.

2006 год Беларусь завяршыла з адмоўным сальда у $1,663 млрд — каля 4,5% ВУП. Падаражаньне газу з $46,7 да $100 за 1000 м³ і ўвядзеньне Расеяй пошліны на нафту для Беларусі ў памеры $53 за тону абыдуцца рэспубліцы яшчэ ў $2—2,5 млрд, лічаць мясцовыя эканамісты.

Прапанова распачаць прыватызацыю дзяржаўных доляў у найбуйнейшых прадпрыемствах краіны зьмешчаная ў Пляне мерапрыемстваў па стабілізацыі сытуацыі на ўнутраным валютным рынку і дасягненьні станоўчага сальда замежнага гандлю краіны ў 2007 годзе. Плян падрыхтаваны Міністэрствам эканомікі Беларусі.

Аўтары праграмы прапаноўваюць правесьці ў 2007 годзе конкурсы па продажы буйных нафтаперапрацоўчых і хімічных прадпрыемстваў, у тым ліку НПЗ «Нафтан», Мазырскага НПЗ, ААТ «Палімір», «Белшыны», «Горадні Азоту», «Магілёва Хімвалакна», «Горадні Хімвалакна».

Прапаноўваюць разгледзець магчымасьць акцыянаваньня з мэтай наступнага продажу стратэгічным інвэстарам найбуйнейшых беларускіх унітарных прадпрыемстваў, у прыватнасьці Менскага аўтамабільнага заводу, «Белтэлекаму» (манапаліст на рынку сувязі і Інтэрнэту), Беларускага цэмэнтавага заводу, гарадзенскай тытунёвай фабрыкі «Нёман». Магчымы продаж дзяржпакетаў акцый буйных прадпрыемстваў харчпраму, у тым ліку ААТ «Менскі завод пеністых вінаў», «Гомельскі тлушчавы камбінат», «Скідзельскі цукровы камбінат», «Гарадзенскі цукровы камбінат», «Жабінкаўскі цукровы завод». Прапаноўваюць прадаць 30—40% акцый найбуйнейшых вытворцаў піва — ААТ «Крыніца», і соладу — ААТ «Белсолад».

Беларускім заканадаўствам прадугледжаныя аўкцыённая і конкурсная формы продажу дзяржпрадпрыемстваў, паведамляе начальнік упраўленьня Мінэканомікі Уладзімір Ваулін, але як будзе арганізаваная прыватызацыя кожнага пэўнага прадпрыемства, казаць пакуль рана, дадае ён. Натальля Жарнасек зь Дзяржаўнага камітэту па маёмасьці Беларусі запэўніла «Ведомости», што хоць адкрытыя продажы прадпрыемства беларускім заканадаўствам не прадугледжаныя, «у выпадку паступленьня выгодных прапаноў яны таксама будуць разглядацца».

Продаж найбуйнейшых беларускіх прадпрыемстваў, найперш нафтахіміі і машынабудаваньня, неўзабаве наўрад ці магчымы, перакананы кіраўнік менскага аналітычнага цэнтру «Стратэгія» Леанід Заіка. Распрацоўка такой вялікай прыватызацыйнай праграмы хутчэй за ўсё была «панічнай рэакцыяй» Мінэканомікі на наступствы падаражаньня энерганосьбітаў.

Беларусь застаецца негасьцiннай краiнай для замежных інвэстыцый, нагадвае Аляксандр Чубрык зь менскага Інстытуту прыватызацыі і мэнэджменту. Паводле нацыянальнага заканадаўства, урад можа ў любы момант вярнуць кантроль над раней прыватызаваным прадпрыемствам, калі ўвядзе ў яго «залатую акцыю». Таму правядзеньне маштабнай прыватызацыі будзе немагчымае бязь зьмены беларускага заканадаўства.

Але хоць палітычныя фактары будуць тармазіць структурныя рэформы беларускай эканомікі, спыненьне субсыдаваньня з боку Расеі робіць буйнамаштабную прыватызацыю ў Беларусі цягам бліжэйшых гадоў непазьбежнай, лічыць ён.

За два-тры тыдні на конкурсны продаж будзе выстаўлены дзяржаўны пакет акцый (больш як 50%) беларускага заводу па рамонце і тэхнічным абслугоўваньні вылічальнай тэхнікі, распавядае Жарнасек.

Па словах топ-мэнэджэраў дзьвюх буйных расейскіх маслатлушчавых кампаній, расейскім інвэстарам ужо прапанавалі набыць Гомельскі тлушчавы камбінат, праўда, умовы інвэстыцый не вельмі зразумелыя.

Па словах аналітыка Інстытуту каньюнктуры аграрнага рынку Яўгена Іванова, беларускія цукровыя заводы — «найлепшыя на тэрыторыі ўсяго былога СССР», у іх мадэрнізацыю ўкладаліся значныя сродкі, і там ёсьць «ўсе перадавыя тэхналёгіі, якія толькі магчыма прыдумаць». Але топ-мэнэджэр адной буйной расейскай цукровай кампаніі заявіў «Ведомостям», што «рубля свайго не ўклаў бы» ў гэтыя заводы: ён упэўнены, што нават калі прыватызацыя адбудзецца, інвэстараў не дапусьцяць да рэальнага кіраваньня прадпрыемствамі.

Па словах старэйшага віцэ-прэзыдэнта ВТБ Васіля Цітова, у завяршальнай стадыі знаходзіцца зьдзелка па набыцьці «Славнефтебанка». Старшыня праўленьня Нацбанку Беларусі Пётра Пракаповіч паведаміў «Інтэрфаксу», што неўзабаве будуць падрыхтаваныя ўсе дакумэнты для продажу расейскаму «Внешэкономбанку» кантрольнага пакету акцый «Белзьнешэканамбанку». Пракаповіч чакае, што ВТБ і ЗЭБ будуць здзяйсьняць штогадовыя ўклады ў набытыя імі беларускія банкі ў аб'ёме $150—200 млн кожны.

Крыніца, блізкая да Крамля, лічыць, што беларусы наўрад ці рашацца прадаваць сур'ёзныя актывы.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Цяжка скрануць воз эканамічных рэформаў.**

# Бел-чырвона-белы

У Менску зьявілася багата інфармацыйнай прадукцыі да Дня Волі.




У паштовыя скрынкі менчукоў раскідваецца газэта «Выбар» з адкрытым лістом Аляксандра да Аляксандра, Мілінкевіча — да Лукашэнкі, і заклікам «25 Сакавіка: адзначыць галоўнае сьвята краіны». Ёсьць беларускамоўная ўлётка кааліцыі Аб’яднаных дэмакратычных сілаў і кампаніі «За свабоду». А таксама цэлы шэраг налепак. Сярод іх ёсьць налепкі з выявай Мілінкевіча, сіненькія налепкі з выявай гербу Менску.

Але адна з налепак выклікала ў актывістаў неадназначную рэакцыю: гэта налепка, дзе побач намаляваныя два сьцягі — бел-чырвона-белы і чырвона-зялёны, а таксама надпісы «За свабоду!» і «За Беларусь!» У цэнтры налепкі зьмешчаны эўразьвязаўскія зорачкі. Нічога падобнага раней апазыцыя не рабіла. Такім чынам апазыцыя спрабуе адрасаваць сваю прадукцыю да як мага большай людзкой аўдыторыі, каб забясьпечыць масавасьць акцыі 25 Сакавіка.

Ці правільна зьмяшчаць чырвона-зялёны сьцяг побач зь бел-чырвона-белым? Што пра гэта думаюць маральныя аўтарытэты?

Народны мастак Беларусі Васіль Шаранговіч мяркуе, што нельга сумяшчаць у адно дзьве абсалютна розныя сымболікі. «Адзін сьцяг нацыянальны, другі — савецкі. Яны неспалучальныя. Аб’ядноўваць нацыю трэба, але ці такім шляхам. Тое, што робіцца цяпер у дэмакратычных сілах, выклікае больш пытаньняў, чым адказаў. Праз усе іхныя сваркі не вымалёўваецца адзінай лініі, ня бачна, што трэба канкрэтна рабіць у гэтай сытуацыі простаму чалавеку, які не цікавіцца палітыкай. Таму ўсё гэта пад вялікім пытаньнем».

Палітвязьня Артура Фінькевіча бянтэжыць толькі спалучэньне двух сьцягоў. «Нічога кепскага ў самой прапанове нацыянальнага прымірэньня я ня бачу. Асабліва ў сувязі зь нядаўнім лістом Мілінкевіча да Лукашэнкі з прапановай разам адзначыць Дзень Волі. Гэта правільныя крокі. Няхай улада злачынная, нелегітымная, але мы першыя працягваем ёй руку супрацоўніцтва. Ім жа застаецца толькі даць адказ, ці гатовыя яны пайсьці на кантакт. Таму гэты ход цалкам лягічны».

Паэтка Ніна Мацяш, гледзячы на гэта ўсё са свайго Белаазёрску, пазытыўна ўспрымае такія крокі апазыцыі. «Мне б хацелася адзінства, але ня ведаю, ці варта ставіць побач гэтыя сымболікі. Пэўна, было б лепей, каб сьцягоў увогуле не было на налепках. Неабходна ісьці на кампраміс, бо гэты супраціў апошніх гадоў паміж уладай і апазыцыяй вычарпаў сябе. Дыялёг заўсёды магчымы. Я ўхваляю дзеяньні Мілінкевіча, які робіць крокі насустрач. Нельга прыкрывацца толькі адным нейкім лёзунгам. Трэба быць адначасова і за свабоду, і за незалежнасьць, і за Беларусь».

Паэт Генадзь Бураўкін таксама лічыць такія захады апазыцыі слушнымі. «Я быў бы рады, каб у гэты дзень на плошчах краіны поруч зь бел-чырвона-белымі сьцягамі ўзьняліся і чырвона-зялёныя. Гэта, ва ўсякім выпадку, лепш за дубінкі, якія звычайна ўздымаюць улады на Дзень Волі. Калі ўлады згодзяцца на дыялёг, то я гатовы дараваць шмат каму і што. Галоўнае, каб гэтыя людзі сапраўды пакаяліся. Я ня ведаю, ці хопіць мужнасьці ў людзей, якія на працягу многіх гадоў займаліся вынішчэньнем беларускай мовы, прыйсьці на пляц, але я іх туды шчыра запрашаю. Ня ведаю, ці ёсьць гэтыя налепкі сымптомамі нейкага дыялёгу паміж уладай і апазыцыяй, але б вельмі гэтага хацелася б».

Пісьменьнік Адам Глёбус лічыць гэтую ўлётку няздарнасьцю: «Ёсьць эклектыка ў архітэктуры, у палітыцы яна таксама ёсьць. Я ня ведаю, ці можа ў выпадку гэтай дыфузіі адбыцца нешта добрае. Я як мастак не люблю эклектыку, я люблю чысты стыль. Гэтая на-




## АПЫТАНЬНЕ НА САЙЦЕ NN.BY

**Чырвона-зялёны сьцяг у постлукашэнкаўскай Беларусі**

| | |
|---|---|
| Саступіць месца бел–чырвона–беламу | 202 (66.0%) |
| Застанецца дзяржаўным | 26 (8.5%) |
| Будзе ўжывацца нароўні зь дзяржаўным бел–чырвона–белым | 5 (1.6%) |
| Стане сьцягам апазыцыі | 23 (7.5%) |
| Будзе забаронены | 50 (16.3%) |

Усяго прагаласавала: 306

# і чырвона-зялёны побач

лепка няўцямная і няясная, яна нічога не праясьняе. Налепка не дае адказу, ці прыйдзе на пляц Лукашэнка, аднак празь яе на пляц можа не прыйсьці шмат людзей, якія прыходзяць на мітынгі зь бел-чырвона-белымі сьцягамі. Бачна па ўсім, што такую неахайную налепку мог зрабіць толькі няздарны мастак».

Палітоляг Аляксандар Класкоўскі лічыць такі крок памылковым: «Ніхто яшчэ не прызнаўся ў аўтарстве гэтай налепкі, бо, на мой погляд, самі разумеюць, што схібілі. Ідэя пошукаў кампрамісу, дыялёгу з уладай правільная. Але сумяшчаць побач дзьве сымболікі нельга, бо многія ўспрымуць гэта як здраду. Калі ў палітычным пляне такое заігрываньне можна ўспрымаць, то да сымболікі — не. Што да пэрспэктываў 25 Сакавіка, то я наўрад ці думаю, што







там будуць людзі з чырвона-зялёнымі сьцягамі. Улада пакуль ня бачыць у апазыцыі нейкую сілу, зь якой можна было б размаўляць на роўных. Пакуль улады гатовыя толькі выціраць аб апазыцыю ногі. З гэтай прычыны я лічу, што ўлада не наважыцца прывесьці на плошчу нейкую ячэйку БРСМ».

Палітык Алесь Лагвінец пераканаты, што такім крокам нельга адштурхнуць ад удзелу ў сьвяткаваньні: «Ідэя можа падацца спрэчнай і рызыкоўнай, але, на мой погляд, яна ўдалая. Што б мы ні казалі, але і чырвона-зялёны сьцяг стаў часткай беларускай гісторыі. Мы працягваем уладзе руку. Такія налепкі, як мне здаецца, ня могуць адштурхнуць ад акцыі людзей, якія выходзяць на вуліцы з бел-чырвона-белымі сьцягамі, затое дапамагаюць разбурыць вобраз «дэструктыўнай апазыцыі» ў частцы грамадзтва зь неакрэсьленымі поглядамі».

**Зьміцер Панкавец**




**Інтрыга вакол 25 Сакавіка абудзіла да творчасьці інтэрнэт-супольнасьць. Такія «ўлёткі» зьяўляюцца на розных сайтах і ў Жывым журнале.**




## ХРОНІКА

### Звольнены гісторык Анішчанка

Зь Інстытуту гісторыі звольнілі гісторыка Яўгена Анішчанку. Нагода – адсутнасьць рэцэнзіяў на навуковыя працы калегаў ды слабая прэзэнтаванасьць навуковых працаў на канфэрэнцыях. Варта адзначыць, што гэта ўжо пяты звольнены з гэтай установы супрацоўнік. Раней звольнілі Генадзя Сагановіча, Ніну Стужынскую, Андрэя Кіштымава ды Сяргея Тарасава.

**22 лютага**

### Сына Леванеўскага затрымалі з улёткамі

14-гадовага **Антона Леванеўскага** затрымала ахова гарадзенскага рынку «Карона», калі той раздаваў улёткі з паведамленьнем пра плянаваны ў Менску мітынг прадпрымальнікаў. Антона перадалі міліцыянтам. Адзін зь іх, паводле бацькі хлопца, **Валер’я Леванеўскага**, каб давесьці хлопца да дзяжурнай машыны, надзеў яму на адну руку кайданкі. Хлопца даставілі ў РУУС Ленінскага раёну Горадні. Пратаколу затрыманьня і канфіскацыі ўлётак не складалі. Па патрабаваньні Леванеўскага-старшага міліцыя правярае здарэньне.

**24 лютага**

### Затрымалі Насту Азарку

Актывістку незарэгістраванага «Маладога фронту» **Насту Азарку** затрымалі ўвечары за вывешваньне ў цэнтры Нясьвіжу расьцяжкі з надпісам «Свабоду Дашкевічу!»

На дзяўчыну склалі адміністрацыйны пратакол. Пасьля некаторага часу Наста Азарка была вызваленая.

### Дзянісава перавялі ў Віцебск

Затрыманага 16 лютага моладзевага актывіста **Дзяніса Дзянісава** перавялі ў Віцебск, дзе ён быў зьмешчаны ў СІЗА-2.

**26 лютага**

### Царква «Новае жыцьцё» працягвае бараніцца

З 26 лютага па 4 сакавіка ў менскай **царкве «Новае жыцьцё»** адбываецца малітоўны пост. Праўнік царквы **Сяргей Луканін** паведаміў, што на гэты час у царкве адмененыя ўсе мерапрыемствы. Ад панядзелку ўдзельнікі паста будуць начаваць у памяшканьні царквы.

**27 лютага**

### Пракуратура папярэдзіла «Ганцавіцкі час»

Сёлета газэта пазбавілася магчымасьці падпіскі праз «Белпошту» і продажу ў «Белсаюздруку», у дзяржаўных і прыватных крамах. Пракурор Ганцавіцкага раёну **Сяргей Замара** патлумачыў, што газэта атрымала папярэджаньне нібыта за скажэньне зьвестак, атрыманых ад старшыні выбарчай камісіі. Ён не выключае магчымасьці закрыцьця незалежнай ганцавіцкай газэты. **Рэдактар «Ганцавіцкага часу» Пятро Гузаеўскі** лічыць, што сапраўднаю прычынаю ціску на яго выданьне ёсьць рост папулярнасьці газэты, а таксама павелічэньне яе накладу. Сёлета наклад «Ганцавіцкага часу» вырас на 500 экзэмпляраў і дасягнуў трох тысяч. Апынуўшыся па-за дзяржаўнай сыстэмай распаўсюду, выданьне наладзіла ў райцэнтры і вёсках альтэрнатыўную падпіску і дастаўку на дом.

# Зьяўленьне пустаты народу

Пра Мілінкевіча, Лукашэнку і вечную нуду русафілаў у Беларусі піша **Віталь Тарас**.

Нядаўна давялося паглядзець спэктакль «Іванаў» на сцэне Тэатру беларускай драматургіі. На мой дылетанцкі погляд, пастаноўка выйшла цалкам прыстойная, акторскае майстэрства ў цэлым — на ўзроўні. Праўда, у перакладзе Івана Скарынкіна Антон Чэхаў гучыць крыху нязвыкла. Часам цяжка пазбыцца ўражаньня, што дзея п'есы адбываецца не ў расейскай правінцыі пачатку мінулага стагодзьдзя, а ў беларускім мястэчку. Добра гэта ці дрэнна — асобнае пытаньне. Тым ня менш, галоўнага героя п'есы — дэпрэсіўнага інтэлігента Іванава зь ягонай хваравітай рэфлексіяй і сумленнасьцю — наўрад ці назавеш тыповым пэрсанажам нашых дзён. (Пры тым, што колькасьць самгубстваў у Беларусі, згодна са статыстыкай, расьце). Больш тыповым падаецца граф Шабельскі, які з усяго зьдзекуецца, з усяго зьедліва насьміхаецца ды піша ананімкі зь «любові да праўды». Пра яго іншы пэрсанаж п'есы кажа, што графу лепей набіць рот пакляй, падпаліць і потым пыхкаць смуродам на людзей.

Гэты спэктакль мне ўспомніўся пасьля таго, як патрапіўся на вочы артыкул «Шум вакол мэсыджу» на сайце «Наша меркаваньне».

Каб пазьбегнуць эфэкту, падобнага да таго, што ўзьнік падчас перакладу Чэхава на беларускую мову, і каб не сказіць думку й стыль аўтара, што падпісаўся як Андрэй Сакалоў, прывяду некалькі фрагмэнтаў артыкулу на мове арыгіналу:

«Среди наших пикейных жилетов оживление. Ну как же! Бывший Единый, но всё еще остающийся, по крайней мере для Запада, Единственным, послал, как теперь говорят образованные люди, мессидж нашему Великому и Ужасному».

«И как же взбаламутилось наше пикейно-жилетное болото! Какие тут пошли прикидки, расчеты, анализы, схватки и полемики! В лавочке, именуемой Национальной, даже опрос провели: а вы бы подали руку Великому и Ужасному?»

«Руку, товарищ Великий и Ужасный!!! Ведь у нас столько общего! Это неважно, что народ безмолвствует. Он дурной, некультурный, не знает правильной дороги. Мы и без него, без дядьки Антося и тетки Гэли, всё как надо сделаем. Как ты делал и делаешь. Мы согласны».

«Но тихо, мертво вокруг. И уже затихает шум от мессиджа Единственного. И надо ждать нового события.

А пока — всё та же тоска, собачья тоска.

И собачье ожидание — кто бы пригрел, погладил?»

Палемізаваць зь невядомым мне аўтарам, захопленым уласным сарказмам, падаецца лішнім. Але з другога боку, гэты артыкул уяўляецца вельмі характэрнай і тыповай рэакцыяй часткі журналістаў на апошнія падзеі ў асяродку дэмакратычных сілаў. Не выкрываньне «Нашай Нівы», якую аўтар грэбліва называе «нацыянальнай лавачкай». А менавіта ацэнка апошніх падзеяў, найперш — ліста Мілінкевіча Лукашэнку. Апошні не называецца сваім імем, але параўноўваецца з героем казкі «Чараўнікі смарагдавага гораду» — Гудвінам, «вялікім і жахлівым». Іншыя палітыкі, а таксама й журналісты параўноўваюцца з пэрсанажамі «Залатога цяляці» Ільфа і Пятрова — «пікейнымі жылетамі».

> Не спрабаваць выкарыстаць момант у беларуска-расейскіх адносінах на карысьць незалежнасьці было б памылкай.

Карціна, якую малюе аўтар, за апошнія пятнаццаць гадоў сталася звыклай для чытача, дзякуючы падобным публікацыям: вакол пустыня і мярцьвечча. Што «нацыянальная лавачка», што нейкія там лібэралы — адное рабое. «И скучно, и грустно, и некому руку подать».

Як у тым савецкім анэкдоце — усе вакол у г…, адзін я ў белым фраку. Паводле лёгікі аўтара артыкула, сядзеў бы Мілінкевіч спакойна, ведаў бы сваё месца, адведзенае яму загадзя палітыкамі ды паліттэхнолягамі, не вытыркаўся б са сваім лістом — ніхто б яго і не чапаў. Бо пакуль ён сядзеў ціха, вакол віравала ўсімі фарбамі палітычнае жыцьцё. А як толькі напісаў — дык адразу невядома скуль узялася туга.

Але самае галоўнае, што вынікае з публікацыі ў «энэмэнбай»: альтэрнатывай гнюснай сытуацыі ў Беларусі можа быць толькі Расея, дзе інтэлектуальнае жыцьцё квітнее ня толькі ў Інтэрнэце, дзе самыя розныя апазыцыйныя газэты ды часопісы — вы не паверыце! —прадаюцца. «І не падпольныя, а ў кіёсках, у каталёгах, у нармальных друкарнях. А ўжо свае тэле- і радыёканалы — гэта такое шчасьце было б. Ужо як бы дзякавалі Вялікаму і Жахліваму за такую міласьціну. Рукі-ногі цалавалі б!» — малюе карціну росквіту «сувэрэннай дэмакратыі» ў Расеі Андрэй Сакалоў. Толькі дзе ён, цікава, бачыў хоць адзін расейскі тэлеканал, які б ня тое што крытыкаваў — ня славіў бы Пуціна ды ягоную мудрую палітыку на ўсе лады ад раніцы да вечара? Ці лабызаць задняе месца расейскаму кіраўніку Сакалоў лічыць заняткам больш гігіенічным і натуральным, чым цалаваць канечнасьці іншых дыктатараў? Так бы мовіць, ногі мыць і ваду піць.

Можа быць, зьяўленьне найноўшага інтэрнэт-праекту ў расейскім інтэрнэце, створанага загадкавым рухам за вылучэньне Лукашэнкі ў кандыдаты на прэзыдэнта Расеі на выбарах-2008, ёсьць таксама прыкметаю дэмакратыі, а не правакацыяй расейскіх спэцслужбаў? І крэмлезнаўца Паўлоўскі ў сваёй перадачы на НТВ гаворыць, што большасць апытаных расейцаў падтрымалі б «зьвяржэньне рэжыму» Лукашэнкі проста так, дзеля прыгожага слоўца?

Можа быць.

Толькі вось сайт «Беларускі партызан», які спадар Сакалоў абараняе ад нехарошых людзей з «нацыянальнай лавачкі», надрукаваў нядаўна артыкул Валер'я Косткі, дзе той папярэджвае: «Нацыянальныя ідэі апазыцыі ніколі ня ўпісваліся ў імпэрскія расейскія ідэі. Таму агентура ўплыву, як у атачэньні прэзыдэнта, гэтак і ў апазыцыйным асяродку, прыкладае ўсе намаганьні дзеля абмежаваньня ўсялякага ўплыву




**Беларусь застаецца ў полі расейскай культуры — палітычнай і пабытовай. На фота: 25 лютага, беларускі спэцназ інсцэнізуе расейскую нацыянальную забаву — масьленічныя кулачныя баі.**

з боку апазыцыі на кіраўніка дзяржавы, каб ня даць ідэям нацыянальнага адраджэньня узьняцца на ўзровень дзяржаўнае палітыкі… Можа скласьціся прынцыпова новая сытуацыя, калі нацыянальнай апазыцыі будзе процістаяць ня ўлада, але апазыцыя з прарасейскімі інтарэсамі».

У гэтай сытуацыі, на думку Валер’я Косткі, адказнасьць нацыянальнае апазыцыі за будучыню Беларусі, яе незалежнасьць, узрастае неймаверна. Далей ён крытыкуе апазыцыю за адсутнасьць еднасьці, за тое, што ўнутраныя разборкі выносяцца на публічнае абмеркаваньне, і гэта шкодзіць ёй як унутры краіны, гэтак і па-за яе межамі.

Усё гэта бясспрэчна. Як бясспрэчна й тое, што ні апазыцыя, ні хтосьці зь яе лідэраў ня могуць быць «сьвятарнымі каровамі», якіх нельга крытыкаваць у прэсе. (У вольнай прэсе, зразумела, а не ў дзяржаўных сродках масавай прапаганды, якія СМІ, строга кажучы, не зьяўляюцца).

Але ёсьць крытыка і крытыка. Калі палітыка, ці нейкую іншую публічную асобу публічна абвінавачваюць у здрадзе апазыцыі ды справе дэмакратыі ўвогуле, гэта больш нагадвае данос, чым крытыку. І ня так важна, куды скіраваны данос — у Адміністрацыю прэзыдэнта Беларусі, у Крэмль, у Варшаву ці ў «Вашынгтонскі абкам». Мэтай даносаў заўсёды былі ня столькі любоў да праўды і ўсталяваньне ісьціны, колькі зусім іншыя, куды больш прыземленыя інтарэсы даносчыкаў.

Ніхто ў шэрагах беларускай апазыцыі, у тым ліку Мілінкевіч, нідзе не казалі аб тым, што яны даруюць кіраўніку Беларусі зьнікненьне людзей, палітычныя арышты, няправедныя суды, фальшаваньне выбараў. Яны проста прапануюць яму скарыстацца унікальным момантам дзеля таго, каб папрацаваць на карысьць Бацькаўшчыны, а ня толькі на сябе.

Хутчэй за ўсё, Лукашэнка ня пойдзе насустрач апазыцыі, бо гэта пярэчыць ягонай прыродзе. Але, як даўно вядома ў палітыцы, каб быць рэалістамі, трэба патрабаваць немагчымага.

Не спрабаваць выкарыстаць сёньняшні момант у беларуска-расейскіх стасунках на карысьць незалежнасьці й дэмакратыі Беларусі было б значна горшай памылкай, чым падстаўляцца пад агонь крытыкі абаронцаў Вялікай і Жахлівай Энэргэтычнай Дзяржавы.

Гэтым крытыкам ніколі не было справы да Беларусі. Для іх яна была і ёсьць «национальной лавочкой». Жывучы ў Беларусі як у расейскай правінцыі, не адчуваючы ні малейшае павагі да беларускай гісторыі, мовы й культуры, яны былі й застаюцца правінцыяламі. Для іх любы беларускі палітык, грамадзкі дзеяч, журналіст паводле свайго вызначэньня нецікавы й нудны, няздольны сказаць ці зрабіць нешта каштоўнае, вартае іхнае ўвагі, а не выскаленьня альбо пустога сьцёбу.

Але ж ім, насамрэч, няма справы і да дэмакратыі, паколькі называць дэмакратычным рэжым, які ўсталяваўся ў Расеі пры Пуціне, можа альбо ідыёт, альбо вельмі лукавы чалавек. Ня маючы цьвёрдых прынцыпаў, яны, падобна чэхаўскаму графу Шабельскаму, размахваюць сваёй палемічнай шабелькай направа й налева, не шкадуючы ні сваіх ні чужых, ні «нацыянал-здраднікаў», ні «лібэрастаў».

Толькі, як казаў некалі Леў Талстой пра Леаніда Андрэева: «Ён палохае, а мне ня страшна». Аўтару «НМ» падаецца, што ён жыве ў пустыні, і яму хочацца скуголіць ад нудоты? На здароўе.

Астатнім нудзіцца няма калі.

# Масква... Як мала ў гэтым гуку

для беларускага сэрца застаецца. Піша Зьміцер Панкавец.

## «Прывязі балалайку»

Масква перастала ўспрымацца беларусамі як своеасаблівы цэнтар сусьвету. Для маладых беларусаў паездка ў Маскву цяпер хутчэй мяжуе зь нейкім экстрымам. Усё меней перад Масквой павагі і страху, а ўсё болей сьцёбу і насьмешак. Амаль кожны, хто ведаў, што я зьбіраюся на чатыры дні ў расейскую сталіцу, прасіў прывесьці балалайку ці фафудзьдзю альбо сфатаграфаваць мядзьведзя на Краснай плошчы. Сапраўды, мы жывем сваімі стэрэатыпамі пра Маскву. Не заўсёды адпаведнымі і слушнымі. Цяжка сказаць адназначна, хто ў гэтым вінаваты: мы ці расейцы. Аднак факт застаецца фактам.

Па расейскім тэлебачаньні пасьля газавага скандалу амаль перасталі паказваць Лукашэнку. Тыя ж расейцы, што яшчэ зусім нядаўна ляпалі сябе ў грудзі і прызнаваліся ў любові да беларускага лідэра, крыху паспакайнелі ў сваіх ацэнках і пазыцыях. Ня здраджваюць беларускаму ідэалу толькі левыя шавіністы, якія распачалі праект «Лукашэнка — прэзыдэнт Расеі-2008». У мэтро ўжо пасьпелі зьявіцца такія налепкі. Увогуле, беларуская тэма робіцца непапулярнай у Расеі. Цяпер на ёй цяжка зарабіць нейкія палітычныя пункты.

На вокладцы каталёгу «Товары и цены Москвы», што ляжыць у гатэлі «Измайлово», зьмешчана рэкляма берасьцейскай фірмы «Санта-Брэмар». Беларускія тавары ў Маскве пакуль ня рэдкасьць. Але асабліва патрыятызм адчуваецца, калі бачыш на маскоўскай вуліцы трактар «Беларус», што расчышчае дарогі ад сьнегу.

## Павал Шарамет: «Лукашэнка пачне размаўляць па-беларуску»

Варта было бачыць, як тэлежурналіст Павал Шарамет рэагаваў на словы старшыні БАЖ Жанны Літвіной і галоўнага рэдактара «Белорусов и рынка» Вячаслава Хадасоўскага, што расейская журналістыка яшчэ не пазбавілася да канца імпэрскіх комплексаў і стэрэатыпаў. Здавалася, што Шарамета нібыта нехта ўвесь час торгае.

Вось што сказаў сам Павал наконт беларускай сытуацыі: «Пакуль у Беларусі існуе рэжым, мы можам усе працаваць разам. І нацыяналісты, і імпэрыялісты, і расейскамоўныя, і беларускамоўныя, і тыя, хто жыве ў Маскве, і тыя, хто жыве ў Варшаве. У нас ёсьць вышэйшая планка, якая дае нам магчымасьць аб'ядноўвацца і не дазваляе падонкам і нягоднікам выкарыстоўваць нас у сваіх мэтах. Гэта планка свабоды і дэмакратыі. Якая розьніца, з кім Лукашэнка сёньня вядзе перамовы, — з Масквой ці Брусэлем? Якая розьніца, на якой мове гаворыць Лукашэнка, — на беларускай ці расейскай? Хутчэй за ўсё, заўтра ён загаворыць па-беларуску, і вельмі многім у такім выпадку давядзецца рабіць сур'ёзны выбар. Бо яны будуць бачыць неадпаведнасьць таго, што гаворыць Лукашэнка, з тым, што ён робіць.

Мы можам не падабацца адно аднаму, але дзеля адзінай мэты мы мусім быць цяпер разам. Гэта як было падчас вайны, Чэрчыль ненавідзеў Сталіна, Сталін — Рузвэльта і г.д. Аднак яны былі разам, каб перамагчы фашызм.

Вельмі добра, што прачнуліся палякі, бо даўно ўжо трэ' было. Добра, што палякі дапамагаюць Беларусі змагацца за свабоду. Добра, што Лукашэнка пасварыўся з Пуціным, бо, магчыма, Масква таксама прачнецца. Усім патрэбна, каб Беларусь была незалежнай дзяржавай і прагназаваным партнэрам. Нам патрэбна, каб там не забівалі людзей, і ўсім патрэбныя зразумелыя правілы гульні.

Сайт «Беларускі партызан» ніхто не фінансуе. Гэта ніякі не праект Крамля. «Партызан» узьнік з размовы некалькіх журналістаў. Людзі на гэты праект працуюць абсалютна дарма. Чаму матэрыялаў на расейскую тэматыку там болей, чым на польскую? Бо маскоўскі карэспандэнт працуе лепш і больш інтэнсіўна, чым варшаўскі.

Хваліце Мілінкевіча, калі вам ён падабаецца, але рабіце гэта за канкрэтныя справы, а не авансам».

Характэрна, што словы «незалежнасьць», «мова» ці «імпэрыя» Шарамет прамаўляў падкрэсьлена па-беларуску. Адразу падумалася, што нешта падобнае робіць Лукашэнка, калі прамаўляе пра беларускую апазыцыю.

Яшчэ прыгадаліся публікацыі на «Белорусском партизане» і «Нашем мнении» гадовай, і двухгадовай, і трохгадовай даўніны, аўтары якіх прадказвалі, што «заўтра Лукашэнка загаворыць па-беларуску».

## Натальля Грыб: «Няма рубля — няма газу»

Журналістка «Коммерсанта», беларуска Натальля Грыб ня першы год спэцыялізуецца ў асьвятленьні энэргетычных пытаньняў. Яна і пракамэнтавала нядаўні беларуска-расейскі паліўны канфлікт. Пры гэтым яна адразу папярэдзіла, што робіць гэта ня як беларуска, а выключна як журналістка расейскага выданьня.

«Наколькі я ведаю, з расейскага боку не было ніколі канкрэтных рэкамэндацыяў пачаць газавую вайну зь Беларусьсю. Было вырашана перавесьці Беларусь на рынкавыя цэны, пры гэтым не рабіць ніякіх палітычных заяваў. Пасьля Новага году я размаўляла з прэс-сакратаром «Газпрому» Сяргеем Купрыянавым. Пытаюся, чаго яго не відаць сёлета на экранах тэлебачаньня, як летась падчас украінскага газавага скандалу. Ён адказаў, што ва Ўкраіну ён болей неўязны.

Ёсьць пытаньне энэргетычнай бясьпекі кожнай краіны. Да Беларусі ў гэтым выпадку не было прыменена нешта звышнатуральнае. Газавы канфлікт — гэта не асабістае стаўленьне Масквы да Менску ці Пуціна да Лукашэнкі. Да гэтага часу абсалютна ўсе краіны, апроч Беларусі, перайшлі на рынкавыя цэны. Зь Беларусьсю гэтага не было, бо да апошняга афіцыйны Крэмль спадзяваўся, што Лукашэнка пойдзе на ўвядзеньне расейскага рубля ў Беларусі. Калі стала зразумела, што гэтага ня будзе, то і прадаваць беларусам газ па ранейшых цэнах не было сэнсу. З камэрцыйнага меркаваньня кантракт, які заключыла Беларусь на пастаўку газу, вельмі добры. Заплаціць меншую цану было папросту немагчыма.

Калі б два гады назад Украіна і Беларусь аб'ядналі свае намаганьні ў перамовах з Расеяй, то кожная з краінаў магла б мець значна лепшыя ўмовы, чым маюць цяпер. Але беларусы чамусьці ніколі ня ўмелі сябраваць з украінцамі супраць Расеі. Увогуле новы патэнцыйны энэргетычны праект Беларусі, Украіны і Літвы вельмі «цікавы».

Расеі таксама патрэбны трубаправод, які будзе праходзіць па дне Балтыйскага мора, у абыход Беларусі і Польшчы, бо з гэтымі краінамі часам вельмі цяжка аб нечым дамовіцца».

## Пасьля Калюмбіі і Філіпінаў

Генэральны сакратар Саюзу журналі-

стаў РФ Ігар Якавенка досыць спакойна расказвае пра тое, што за апошнія дзесяць гадоў у Расеі было забіта больш за 200 журналістаў. Па гэтым паказчыку наша ўсходняя суседка саступае толькі Калюмбіі і Філіпінам. Расейскія журналісты разважаюць пра тое, у якой газэце прасьцей за ўсё замовіць артыкул, у якой цяжэй. Пра тое, што недзе зрабіць гэта немагчыма, гаворка, здаецца, увогуле не вядзецца. Разам з тым яны абураюцца з таго, што шоўмэн Малахаў становіцца самым папулярным журналістам Расеі. Яго яшчэ, праўда, апярэджвае Позьнер, але відавочна, што сваю пазыцыю ён хутка страціць. Расейцы пераконваюць, што іхняя журналістыка знаходзіцца ў крытычным стане.

Патрыярх расейскай журналістыкі Аляксей Сіманаў расказвае, як нядаўна арыштавалі маладую рэдактарку газэты адной маскоўскай акругі. «Яе, скажам умоўна, арыштавалі 15-га чысла, але яшчэ 14-га другая акружная газэта піша, што яна ўжо арыштаваная. Аказваецца, што гэта разборкі паміж дзьвюма варагуючымі кастамі. Гэтая дзяўчына апроч журналістыкі займаецца яшчэ і «незаконнымі падаткаабкладаньнямі», спаганяючы грошы з гандляроў на мясцовых кірмашах. Незразумела, ці мусім мы абараняць такую журналістку»?

Галава камісіі па правох чалавека пры прэзыдэнту Расеі Эла Панфілава ўвесь час нібыта спрабавала апраўдацца. Яна заявіла: «Мы працуем дзеля таго, каб дэмакратычная меншасьць магла даносіць свае погляды да Ўладзімера Пуціна». Панфілава казала, што камісія як мага рэагуе на парушэньні правоў чалавека ў Беларусі.

Пры гэтым зьніклага Віктара Ганчара яна называла Ганчарэнкам. Разам з тым спн.Панфілава прасіла прабачэньня ў беларускіх журналістаў за тое, што некаторыя іхныя расейскія калегі дазваляюць сабе рабіць некарэктныя выказваньні ў бок незалежнай дзяржавы. Успамінаўся прыклад нядаўняй праграмы Ўладзімера Салаўёва на тэлеканале НТВ.

### «Салдаты» супраць «У жніўні 44-га»

Пакуль у Беларусі спрачаюцца, ці варта віншаваць мужчын з гэтым днём, у Расеі 23 лютага адзначаецца як дзяржаўнае сьвята. А ў 21:00 па ўсёй Маскве пачаліся выбухі салютаў, якія доўжыліся з паўгадзіны. Народ патрабуе сьвята. Па тэлебачаньні цэлы дзень круцяць прапагандысцкія праграмы і канцэрты, якія мусяць уздымаць патрыятызм у расейцаў, а таксама цэлую плойму розных фільмаў на вайсковы тэмат. Ад сэрыялу «Салдаты» і ДМБ да фільму «Ў жніўні 44-га».

Фільм «Салдаты» ўвогуле падаецца ідэальным агітацыйным манэўрам. Гледзячы на бравыя прыгоды герояў тэлесэрыялу, шмат у каго з маладых расейцаў узьнікне жаданьне паслужыць у войску. Меней будзе тых, хто косіць і пазьбягае позваў у ваенкамат. Праўда, ужо 24 лютага тэлеканал REN-TV паказвае рэпартаж пра «дзедаўшчыну» і пазастатутныя адносіны ў расейскім войску. Глядзіш — і становіцца крыху ніякавата. Усё ж уявіць нешта падобнае ў Беларусі цяпер ужо цяжка.

Дзе-нідзе ў прыбіральнях ці ў мэтро можна заўважыць налепкі з рэклямай інтэрнэт-парталу, які абяцае расказаць усю праўду пра вайну ў Чачэніі. Аднак, відаць, зь імі змагаюцца так сама, як з налепкамі «За свабоду» ў Менску.

На маскоўскіх вуліцах усё ж ня ходзяць мядзьведзі, але ходзяць стылізаваныя Ленін і Мікалай II. Едучы дадому, ты адчуваеш, што вяртаесься ў якую-ніякую, але Эўропу.

**Масква—Менск**




**У Расеі некалькі дзеячоў-нацыяналістаў стварылі рух «Лукашенко — президент России-2008». На фота: адзін з постэраў з сайту руху.**

# Ствараецца музэй Манюшкі

Днямі такое рашэньне прынялі ўрады Літвы й Польшчы.

Цэнтар у гонар славутага кампазытара мае паўстаць у найпрыгажэйшым кутку старое Вільні, побач з касьцёлам Сьв.Кацярыны, пры цьвінтары якога месьціцца стары сквэр імя Манюшкі. Сквэр з XIX ст. упрыгожвае помнік кампазытару.

Манюшка нарадзіўся ў фальварку Убель ( Чэрвеньшчына) ў шляхецкай сям’і. У Менск пераехаў з бацькамі, якія прыбылі сюды наглядаць за вучобай сына. Сям’я Манюшкаў жыла на рагу вуліц Валоцкай і Дамініканскай (Інтэрнацыянальнай і Энгельса), у доме Клімкевіча, а потым на Высокім рынку, у доме Паляковай.

Той дом Манюшкаў быў напоўнены атмасфэрай культурнага жыцьця. Маці сьпявала і грала на фартэпіяна, ладзіла музычныя вечарыны. Частым госьцем у Манюшкаў быў музыка і літаратар Пётр Карафа-Корбут, кіраўнік мясцовага аркестру Дамінік Стэфановіч. Пад яго клапатлівым крылом Манюшка атрымліваў музычную адукацыю, Стэфановіч падрыхтаваў яго да засваеньня кампазытарскага майстэрства ў Рунгэнгагена ў Бэрлінскай кансэрваторыі.

А зь Вільняю Манюшку лучылі 18 гадоў жыцьця. Тут ён быў арганістам у касьцёле Сьв.Яна пры ўнівэрсытэце. Касьцёл збудаваны быў паводле праекту дойліда зь Менску Яна Франкевіча. А арган прывезьлі сюды з… Полацку, з сабору Сьв.Стафана, што расейцы перарабілі пасьля 1831 г. на царкву. На ім упершыню прагучала Манюшкава «Літанія Вастрабрамская», якая і сёньня выконваецца ў касьцёлах.

Апалёнія Сакалоўская, прэзыдэнт Цэнтру польскай культуры ў Літве імя Манюшкі, кажа: «Гэта выбітная постаць, якая ўславілася ня толькі ў Вільні, але і ў Эўропе, у Нямеччыне, дзе вучыўся кампазытар, у Парыжы, Пецярбургу. Музэй Манюшкі будзе складовай часткай культураў літоўскай, польскай ды беларускай, будзе ўвасабляць і перадаваць досьвед патрыятызму, пачуцьця супольнасьці й павагі, не зважаючы на адрозьненьні.«Шмат культураў — адна айчына!».



Ідэю горача падтрымаў мэр Вільні Артурас Зуокіс.

Наладжаныя ў юнацтве менскія знаёмствы аказаліся вельмі трывалымі і працяглымі. Сяброўства лучыла яго зь Вінцэнтам Дуніным-Марцінкевічам. У 1841 г. у Менску была пастаўленая апэрэта «Рэкруцкі набор» на музыку Манюшкі й словы Дуніна-Марцінкевіча. У 1843 г. у Менску Манюшка на замову мясцовага тэатру піша музыку да драмы «Каспар Гаўзэр» Анісье, Буржуа і д’Эп’еры. У Менску ён быў тым годам яшчэ раз, калі трупа Шмідкопфа ўпершыню паставіла апэрэту Манюшкі «Лятарэя».

Дунін-Марцінкевіч напісаў лібрэта да опэры Манюшкі «Чарадзейная вада», апэрэты «Спаборніцтва музыкаў». А 155 гадоў таму й выбітны твор эўрапейскае музычнае культуры — опэра «Сялянка» («Ідылія») упершыню была пастаўленая ў гарадзкім тэатры Менску. Адсюль пачынае адлік гісторыя беларускага сцэнічнага мастацтва.

Некалі шыкоўная рэзыдэнцыя Манюшкаў у Сьмілавічах цяпер у руінах. Даўно няма касьцёлу ў былым Ігумене, дзе хрысьцілі Манюшку, а пра Ўбельскі фальварак нагадвае літаграфія Напалеона Орды… У 1986 г. у Менску дайшла чарга і да будынку гарадзкога тэатру. Тады ўпершыню беларуская моладзь з транспарантам «Руйнуюць помнік беларускай культуры» выйшла тэатар абараняць. Але марна. Будынак зруйнавалі, моладзь зьбілі.

На жаль, і бацькоўскі дом Манюшкі на рагу Інтэрнацыянальнай і Энгельса быў колькі гадоў таму зьнішчаны падчас прыстасаваньня яго пад кавярню-бар. На ацалелай вонкавай сьцяне, праўда, прымацавалі мэмарыяльную табліцу ў гонар славутага земляка. І летам яе ўпарта застаўляюць парасонамі той кавярні-бару. Ні пра які музэй Станіслава Манюшкі ў Беларусі няма й гаворкі.

**Сяргей Харэўскі**

## ПАВЕДАМЛЯЕ РАДЫЁ «ПАЛЁНІЯ»

### Фільм пра Касьцюшку

Сьляды Тадэвуша Касьцюшкі Алег Лукашэвіч шукаў у шасьці краінах. Здымкі праходзілі ў ЗША, дзе Касьцюшка зрабіў кар’еру ваеннага інжынэра й атрымаў званьне Нацыянальнага героя; у Францыі, дзе атрымаў адукацыю; у Польшчы, дзе праявіўся дасканалым стратэгам-генэралам; у Расеі, дзе быў зьняволены ў Петрапаўлаўскай крэпасьці; і ў Швайцарыі, дзе Касьцюшка скончыў зямны шлях. Фільм расказвае пра малавядомы швайцарскі тастамэнт беларускага нацыянальнага героя. Гісторыкі кажуць толькі пра тастамэнт, які Касьцюшка пакінуў у Амэрыцы. Ён усе свае грошы прызначыў на вызваленьне нявольнікаў, іх адукацыю й дапамогу іх сем’ям. У швайцарскім тастамэнце даў волю сваім сялянам у Сяхновічах, вёсцы на Берасьцейшчыне, ад якой сёньня застаўся толькі парк. Дакумэнтальны фільм «Тадэвуш Касьцюшка. Вяртаньне героя» складаецца з 4 сэрыяў.

### Міліцыянтаў пасадзяць на дыету

Такой навіной парадавала журналістаў загадчыца аддзяленьня прафіляктычных аглядаў цэнтральнай паліклінікі МУС Эмілія Мезіна. Яна распавяла, што толькі за леташні год да яе ў паліклініку трапілі 9 супрацоўнікаў міліцыі з інсультам, два з інфарктам, 35 са стэнакардыяй. І ўсё гэта — просты вынік азызласьці. Цягам трох гадоў на паказьнік залішняй вагі будуць дасьледаваныя ўсе супрацоўнікі органаў унутраных справаў Беларусі. Напачатку тлустых міліцыянтаў ня будуць лячыць адмысловымі прэпаратамі, але будуць старацца ўпэўніць задумацца пра здароўе.

### Прэзыдэнт Малдовы абараняе румынаў

Прэзыдэнт Малдовы Ўладзімер Воронін патрабуе прызнаць правы малдаўскай нацыянальнай меншасьці ў Румыніі. Паводле Вороніна, яна налічвае прынамсі 10 млн чалавек, гэта амаль палова насельніцтва Румыніі. Уладзімер Воронін абвінавачвае румынскія ўлады ў тым, што яны не прызнаюць малдаванаў асобнаю нацыянальнасьцю. Румынская прэса выказваньні Вороніна называе элемэнтам «халоднай палітыкі» Кішынёва ў дачыненьні да Бухарэсту.

### Баўгарыя падтрымлівае «Новае жыцьцё»

Баўгарская апостальская рэфармаваная царква Сафіі ў рамках акцыі «Прарыў для Беларусі» перадала ў Пасольства Беларусі ў Баўгарыі больш за 600 лістоў у падтрымку царквы «Новае жыцьцё». Пасол Беларусі ў Баўгарыі Мікалай Пазьняк абяцаў, што цягам двух тыдняў ён паведаміць афіцыйную рэакцыю на гэтыя лісты Міністэрства замежных справаў Беларусі.

**www.polskieradio.pl/polonia.by**

# Gieny palcam nie zatyknieš

Prezentacyja supolnaha litoŭska-biełaruskaha muzyčnaha prajektu «Tylos Labanoro/Cišy Łabanory», prymierkavanaja da nacyjanalnaha śviata Litoŭskaje Respubliki — Dnia adnaŭleńnia dziaržaŭnaści, stała admysłovaj novaj viachoj va ŭzajeminach elitaŭ dvuch rodnasnych pavodle pachodžańnia j historyji narodaŭ.

Prajekt byŭ zapačatkavany čatyry hady tamu biełaruskim mastakom i majstram pa vyrabie dudaŭ Todaram Kaškurevičam i litoŭskim fatohrafam i prychilnikam kulturnych tradycyj dachryścijanskaj «letapisnaj» Litvy Gvidasam Koveram jak «forma impravizacyjnaha muzykavańnia» ŭ vyciečkach pa śviaciliščach, śviatych krynicach dy haradziščach na terytoryji dźviuch krainaŭ.

Sa słovaŭ G.Kovery, ciapier 90% dudaŭ, jakimi karystajucca dudary ciapierašniaj Litvy, zroblenyja rukami Todara (darečy, syna patryjarcha biełaruskaj hrafiki Arlena Kaškureviča). A aŭtentyk-folk vakalistki z hurtu rytualnaha falkloru «Essa» Volha Dziadovik i Śviatłana Klepikava pranikniona adcianili mahičnaje hučańnie dudaŭ vykanańniem biełaruskich i litoŭskaj abradavych piesień. Nu pra džazavaha soła-saksafanista Piatrasa Višniaŭskasa lubyja napisanyja słovy padaducca niedastatkovymi — prosta niemahčyma pieradać zvyšnaturalnaje ŭmieńnie padchoplivać-raźvivać lubuju impravizacyjnuju temu, zadadzienuju dudarami abo hałasami vakalistak «Essa». Škada tolki, što Miensk nie patrapiŭ naviedać jašče adzin stały ŭdzielnik prajektu, virtuozny muzyka Rycis Kamičajcis, jaki hraje na indyjskich tabłach (reč ŭ tym, što prychilniki «neapahanskaha» napramku ŭ sučasnych Biełarusi j Litvie jość, jak praviła, prychilnikami idei pošuku vytokaŭ našaj protakultury ŭ aryjaŭ, jakija žyli na paŭnočnym uschodzie Indastanu).

Sa słovaŭ novapryznačanaha ambasadara Litoŭskaj Respubliki ŭ Biełarusi Edminasa Bagdonasa, padobnyja prajekty pakazvajuć padabienstva kulturaŭ dvuch narodaŭ i dapamahajuć zblizić našyja krai. Bolš za toje, peŭna, upieršyniu možna było pačuć ad aficyjnaha pradstaŭnika litoŭskaje dziaržavy abiacańnie vyvučyć tuju movu, «na jakoj pisali listy vialikija litoŭskija kniazi». Zrešty, E.Bagdonas viadomy jak adorany paligłot, jaki vałodaje vaśmiu zamiežnymi movami, u tym liku nadta blizkimi da biełaruskaj ŭkrajinskaj i słavackaj. Dyj žonku maje, jak žartuje sam, «u tradycyjach Mindoŭha i Vitaŭta — pradstaŭnicu Kijeŭskaha kniastva». Spračacca nia budziem, najaŭnaść žonki-ŭkrainki pavinna žyvić mentalnyja prasłavianskija sentencyji. Ale vyvodzić jaŭna zroblenyja nasustrač nacyjanalna-aryjentavanaj častcy biełaruskaha hramadztva słovy vyklučna z asabistych admietnaściaŭ novaha reprezentatara Vilni/Vilniusa było b niespraviadliva. U dyplamataŭ uzroŭniu sp.Bagdonasa vypadkovych słoŭ nie byvaje. Nahadajem, što jon z 2004 pa 2006 h. źjaŭlaŭsia daradcam prezydenta LR Vałdasa Adamkusa ŭ mižnarodnych pytańniach…



Тодар Кашкурэвіч (зьлева) Пятрас Вішняўскас і Гвідас Ковера.

Padobnyja słovy ŭ aficyjnaj abstanoŭcy niemahčyma było pačuć navat u pačatku 90-ch ad asabistaha pryjaciela Zianona Paźniaka Vitautasa Landsbergisa, kali fon uzajeminaŭ dvuch krajoŭ byŭ nadzvyčaj spryjalny, a pravacentrovaja častka litoŭskaje elity była nadzvyčaj udziačnaja jak «beneefaŭskaj», hetak i «post-kamunistyčnaj» składovaj isteblišmentu RB, jaki tolki naradžaŭsia, za toje, što tyja nie paddalisia na nieadnarazovyja padbuchtorvańni niekatorych maskoŭskich strukturaŭ «pastavić pytańnie ab prynaležnaści» Vilenskaha kraju padčas raspadu SSSR.

Dalejšaja chada padziejaŭ na post-saviećkaj prastory va ŭsich na pamiaci. Litoŭcy, razam sa svaimi bałtyjskimi susiedziami, viarnulisia ŭ eŭrapiejskija struktury, a aficyjny Miensk usie svaje vysiłki skiravaŭ na demantaž niaisnych pamiežnych słupoŭ na maskoŭskim napramku (što prynosiła niadrenny *geschäft* u hulni pad nazovam «supolnaja mytnaja prastora»). Ab supolnych etničnahistaryčnych karaniach pryhadvali chiba asobnyja pradstaŭniki humanitarnych navuk, pieravažna ź biełaruskaha boku...

Hetki rašučy pavarot u mienskim napramku možna pasprabavać rastłumačyć spałučeńniem adrazu kolkich čyńnikaŭ. Pa-pieršaje, ideja stvareńnia Bałtyjska-Čarnamorskaha kalektaru, vielmi papularnaja ŭ pačatku 90-ch, u tym liku i ŭ Biełarusi (jaje aŭtarstva často prypisvajuć mienskamu energietyku i čalcu tady šče adzinaha BNF S.Husaku), apynułasia iznoŭ zapatrabavanaj. Pa-druhoje, pierad vačmi aficyjnaje Vilni paŭstajuć vializnyja vysiłki, jakija pradprymaje Polšča pa farmavańni budučyni biełaruskaha isteblišmentu, jaki «pa zmaŭčańni» nia zmoža drenna stavicca da krainy, dzie navučalisia jahonyja pradstaŭniki.

Dziela spraviadlivaści varta zaznačyć, što zmušany pieranos EHU u byłuju stalicu VKL hetaksama maje svaju leptu ŭ aktyvizacyji litoŭska-biełaruskaha dyskursu. Ale biaz vysiłkaŭ «zvyčajnych asobaŭ» kštałtu Todara Kaškureviča i Gvidasa Kovery hetkaja aktyvizacyja nia mieła b tryvałaha padmurku.

**Vadzim Aleksandrovič**

# У пекле Азіі

Рэпартаж з Аўганістану нашага суайчыньніка **Аляксея Лявончыка.**

**Працяг. Пачатак у №4—6.**

## Гасьціннасьць па-аўганску

Выпраўляюся ў дарогу ў Герат. Неба ўхмаранае, урочыць чаканьне на лётнішчы. Так і аказалася. Дый сусед на летаку нейкі нэрвовы быў, усё ў акно паглядаў. Потым, калі мы селі, ён прызнаўся, што тэмай абвесткі пілёта, якой я не зразумеў, было шасі. Маўляў, выйшла нешта толькі з трэцяга разу. Як добра, што я не разумеў гэтага.

Ужо на сходах ён раптам паварочваецца да мяне і пытае: «Едзем да мяне дадому?» А я зь ім ледзьве трыма словамі перакінуўся ў летаку. Я адмовіўся, але ён настойваў. Спачатку, даведаўшыся, што ў мяне няма машыны, мяне пасадзілі ў сваю ды адвезьлі да гораду, дапамаглі ўзяць квіток на аўтобус. Потым той прапанаваў адвесьці да гатэлю, але ў дарозе заявіў, што вельмі пакрыўдзіцца, калі я не спынюся ў ягонай хаце. Маўляў, у Паштуністане, адкуль ён выйшлы, у вёсках ды мястэчках старэйшыны забараняюць будаваць гатэлі, бо гэта ў іх вачах азначае адмову ад гасьціннасьці. Маўляў, госьці мусяць спыняцца ў хатах, а ня ў нейкіх дамах, дзе ім нават няма каму вячэру згатаваць...

Яшчэ цікавая рэч наконт мячэтаў. У Аўганістане звычайна простыя людзі не пускаюць іншаверцаў у свае мячэты. Дый тыя, збольшага, проста халупы, дзе на падлозе разасланы вялікі дыван. Калі нават немагчыма збудаваць халупу — абносяць сьцяною нейкую плошчу ды ставяць на рагах мэгафоны. У расейскіх жа мячэтах іншаверныя без праблем могуць заходзіць ды разглядаць аздабленьне. Адзіная непажаданка — здымкі. Лепей не рабіць. У адрозьненьне ад праваслаўных, мусульмане ня робяць іконаў, ня робяць аніякіх выяваў анёлаў, прарокаў, нікога. Проста вялікі дом, засланы зялёным дыванам, дзе прававерныя абмяркоўваюць свае справы пасьля малітвы, пацягваючы гарбату на ганку, і куды прыходзяць, калі патрэбная нейкая рада, бо ў мястэчку мула заўжды лічыцца самым вучоным чалавекам. Хаця, са словаў шмат каго, арабскай мовы, на якой напісаны арыгінал Карану, мулы ўсё роўна збольшага ня ведаюць.

Кааба — чорны камень, «жытло Бога», да якога мусульмане робяць хадж, стаіць на месцы храму з ідаламі, які быў зруйнаваны Магамэтам па ягоным вяртаньні ў Мэку з Мэдыны. Тыя ідалы былі разтрушчаныя прыхільнікамі новай веры, і як сымбаль навяртаньня да новага ды Сапраўднага быў пастаўлены той чорны камень. З таго часу пад катэгорыю ідалаў для мусульман простых, паспалітых падпадае ўсё, што ёсьць выяваю чалавека. Яны шчыра не разумеюць, як мы можам маліцца нейкім сьвятым, у той час як яны вызнаюць Магамэта як прарока ды як сымбаль, але якому яны ніколі ня моляцца.

Але нават калі ў звычайных абставінах іншаземцаў не пускаюць у мячэты, то заблуканы падарожнік, якому патрэбная дапамога, асабліва ў Паштуністане, мусіць ісьці проста ў мячэт. Пачакаць, пакуль скончыцца малітва, і патлумачыць муле, што яму патрэбная дапамога. У такім выпадку ён аўтаматычна апынаецца пад абаронай кодэксу гонару паштунаў, паштунвалі. Месцачкоўцы абавязаныя — і гэты абавязак яны вызнаюць за падарунак, бо кожны госьць — то падарунак Бога — накарміць, прытуліць вандроўцу, а ў ліхалецьце даць яму бясьпечны канвой да наступнай вёскі, якая пашле яго далей, да сваіх, дзе той будзе ў бясьпецы... Я чуў, што шмат хто з вандроўнікаў, хто трапіў у непапраўную сытуацыю, карыстаўся гэтым, і аднаму шалёнаму паляку гэта сапраўды дапамагло выратаваць жыцьцё, калі ён зьбег ад талібаў, якія яго ссадзілі з машыны.

Аўганцы — дзіўныя людзі. Яны будуць таргавацца да апошняе капейкі з табою, тыцнуць Калашнікавым у твар на шашы Кандагар—Кабул, зьдзяруць апошнія грошы за самы занядбаны пакой у той вёсцы, дзе цябе засьпела цемра. Яны жывуць па дзесяць чалавек у пакоі, цікаўныя да ўсяго, што адбываецца ў суседа, але абыякавыя — нібыта — да ягоных праблем, яны ня ўмеюць працаваць так, як мы ад іх чакаем, яны заўжды шукаюць нейкага іншага вінаватага. Але як толькі ты ў нядолі — будзь пэўны, што ўся вуліца, вёска, машына будуць дапамагаць табе. Там не існуе такога слова, як інструкцыя. Калі з шашы Файзабад—Талакан (ці лепей назваць яе кірункам?) трэ' было хутка эвакуяваць чалавека, яны ледзьве не навучыліся кіраваць шрубалётам, які нехта пакінуў непадалёк.

Рашучасьць у іх доўжыцца да той пары, пакуль не пачынаецца адказнасьць.

Зь імі цяжка таргавацца, бо яны лічаць, што мы — замежнікі — зарабляем пяць тысяч даляраў штомесяц. У некаторым сэнсе так яно і ёсьць. Мала хто з тых, хто прыяжджае сюды па лініі міжнародных арганізацыяў, зарабляе менш.

## Вера па-аўганску

Але ў тым выпадку — у Гераце, мяне парадаваў іншы факт. Той хлопец увечары запрасіў некалькіх чалавек да сябе. Раней, калі гэта адбывалася, тое мела гучны назоў «агледзіны чужынскага цуду». Але на гэты раз мы вельмі добра пагутарылі з адным з тых адзінаццацікласьнікаў, што далучыліся да нашае вячэры. Ён так і не зразумеў, як я магу быць атэістам, і як хрысьціяне могуць маліцца нечаму таму, што яны стварылі самі. Але ўвогуле сам той факт, што такая гутарка адбылася, гаворыць аб тым, што маладая генэрацыя, пасьляваенная, тут зусім не закасьнелая. Ім трэба яшчэ навучыцца адчуваць межы рэлігійнае свабоды. Бо ўсе людзі, асабліва ў маім офісе, спрабавалі пераканаць мяне, што я мушу стаць вернікам. Не нахабна, а ветліва, тлумачылі яны мне старую, як сьвет, матрыцу Паскаля, што выгодней верыць, чым ня верыць, што ў XXI стагодзьдзі трэба адыходзіць ад нявер'я. Але зноўку — не нахабна. Такое адчуваньне, што яны загадзя ведалі ўсе адказы на пытаньні, ды спрэчка са мною была для іх пацехаю, размовай настаўніка да нэафіта — вучня...

Доктар Нілаб Мубарэц, дачка міністра ўнутраных справаў Аўганістану, адукаваная ў Францыі, была адзіным чалавекам з тых, каго я сустрэў у

Кабуле, хто выказваўся супраць канстытуцыі, якая б грунтавала дзяржаўнасьць на ісламе ды правох чалавека. Трэба абіраць, казала яна. Бо інтэрпрэтацыя рэлігіі зьмяняецца вельмі павольна, а сьвет прыходзіць да Аўганістану вельмі хутка, была ўпэўненая яна. І менавіта таму, што сьвет прыходзіць да Кабулу занадта хутка, і ўзьнікалі розныя канфлікты. Як, напрыклад, усе мужчыны-аўганцы, наглядзеўшыся па індыйскіх каналах мувікаў з Галівуду, былі ўпэўненыя, што ўсе замежніцы — жанчыны «лёгкія». І паводзілі сябе адпаведным чынам. Як і ўпэўненасьць у тым, што іншыя мусяць адаптавацца пад іх, а не яны — пад сьвет. Выпадак з чалавекам, які прыняў хрысьціянства і ледзьве ня быў павешаны, паказваў, наколькі нефункцыянальная гэтая сыстэма. Але для Аўганістану хуткая «вэстэрнізацыя» была б сымбалем культурнае акупацыі. А гэта прывяло б да другога паўстаньня. Асабліва калі ў краіне кожны дзень грымелі выбухі, і аўганцы, пацепваючы плячыма, пыталі мяне, ці гэта і ёсьць дэмакратыя.

Аднойчы я мінаў месца выбуху. Страшна. Чорныя парэшткі мышыны, чыісьці вантробы на дарозе, шматы мяса, плямы крыві, натоўп... І над гэтым атмасфэра страху. Пад талібамі ў Аўганістане было бясьпечна, і цяпер яны ўзгадваюць мулу Амара менавіта ў дачыненьні да бясьпекі. А дэмакратыя для іх ператварылася ў сынонім таго, што ты можаш не вярнуцца, пайшоўшы за хлебам у дукан на рагу.



AP

## Эмоцыі па-аўганску

Я размаўляў са сваім калегам Вайсам. Ён не чытае замежнай прэсы. Ён ня ведае, што адбываецца побач з краінай. Калі я тлумачыў яму нешта наконт пакараньня Садама сьмерцю ціхім разважным тонам, ён гнуў у сваю кішэню. Але калі я пачынаў даводзіць нешта эмацыйна — ён адразу пагаджаўся, нават ня слухаючы зьместу маіх слоў. Я блытаў сунітаў з шыітамі, назваў Садама курдам, але Вайсу не патрэбная была дакладнасьць. Яму трэба было бачыць, што нехта, менавіта як і ён, узрушаны ды абураны тым, што «іракца» больш няма. Людзі тут ня чуюць словаў — яны чуюць эмоцыі. Іх вельмі лёгка пераканаць, калі ты будзеш эмацыйным... Ці беларусы не падобныя ў гэтым да іх?

Джавід аднойчы распавёў мне пра жонку мулы, якая штовечар выцягвала з паліцы Каран, напісаны па-арабску, цалавала яго ды клала на месца. Яна была неадукаваная, не магла прачытаць аніводнага радка з гэтай кнігі, але проста ведала — гэта вялікая кніга. І кожнаму, хто жадаў нават нешта абмеркаваць пра яе, яна гатовая была перарваць пазногцямі горла. Вось эмоцыі.

Аўганцы не жадалі чытаць Сьвятой Кнігі на пэрсыдзкай мове. Калі нехта перакладае, гаварылі яны, ён памыляецца, бо ён чалавек, а гэта — словы Бога. І лепей няхай мулы інтэрпрэтуюць яе, а мы будзем слухаць, чым нехта перакладзе ня так, як трэба, і ўзьнікне блюзьнерскае вальнадумства. Тое, што мулы самі ня ведаюць арабіцы, а проста на памяць завучылі малітвы, ім да галавы не прыходзіць.

**Працяг будзе.**

**Просты хлопец Бульбашэўскі вырашыў зрабіцца беларускім супэрмэнам. Але з-за сваёй наіўнасьці ён робіцца суўдзельнікам крадзяжу іншамаркі...**




МАЛЯВАЎ ЛЯВОН ВОЛЬСКІ

# Вялікі дзякуй за ахвяраваньні

**Мікалаю Ч.** з Наваполацку
**Алене М., І.М.** зь Бярозаўскага раёну.
**Валер'ю П., Паўлу Дз., Алесю Б., А.А., Лідзіі А.** з Баранавічаў.
**Антосю Ц.** з Полацку.
**І.Г.** са Смалявіцкага раёну.
**А.Дз.** з Магілёва.
**В.Д.** з Барысава.
**Ларысе Т.** са Шчучынскага раёну.
**Вользе А.** зь Любанскага раёну.
**Ірыне З.** з Жодзіна.
**Ірыне Г.** з Пухавіцкага раёну.
**Людміле В., Сяргею К., Аляксандру А., Аляксандру Б., Натальлі М.** з Горадні.
**Валянціне З.** з Гомеля.
**Аляксандру Б.** з Капыльскага раёну.
**Ларысе Р.** з Калінкавіцкага раёну.
**Яўгену К.** са Шклоўскага раёну.
**Раману Ч.** з Маларыцкага раёну.
**Сяргею Ц.** з Докшыцкага раёну.
**Міхасю Т.** са Слуцку.
**К.С., Уладзімеру П., Веры К., Сяргею С., Любові Ш., Вользе Г., Ганьне К.** зь Віцебску.
**Мікіце Р.** са Стаўпецкага раёну.
**Барысу С.** са Сьветлагорскага раёну.
**Тадэвушу Ш.** з Маладэчна.
**А.Дз., Вадзіму К., М.П., Уладзіславу Ж., Георгію Л., Вользе К., Віктару П., Міхаілу Ш., Юр'ю Г., Віктару А., Алесю Л., Т.В., Валянціне Ш., Вадзіму М., І.В., В.Т., Л.Г., Юр'ю М., Багуславу У., Зьмітру М., Л.К., Валянціне П., С.Ш., Раману М., Барысу А., Паўлу К., А.Ш., Уладзімеру З., Сержуку Т., Валянціне Г., І.Л., Алене Л., Ц., А.Б., Н.К., Ігару Я., Цімафею Ж., Т.П., Клаўдзіі П., Руслану П., В.Г., Д.К., В.П., Юр'ю М., Валянціне Дз., Т.П., Мікалаю С., Н.Ю., А.Т., В.Г.** зь Менску.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521

МГД ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: **3015 212 000 012** Асабовы рахунак: ____

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір

Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521

МГД ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: **3015 212 000 012** Асабовы рахунак: ____

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

КВІТАНЦЫЯ

Касір М.П.

## Каб штотыдзень атрымліваць газэту,

**дасылайце адрасы і прыватныя ахвяраваньні.**

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@tut.by, паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) Просім кожную сям'ю чытачоў **пералічваць на рахунак** газэты ахвяраваньне з разьліку 8000 рублёў на месяц. Гэтага хопіць на выхад і дастаўку газэты. **У блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначайце адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.** Тыя, хто перакажа 24000 рублёў за раз, забясьпечаць выхад «НН» на 3 месяцы. Хто перакажа 48000 рублёў адразу, гарантуе публікацыю «НН» на паўгоду.

Сьмех і грэх з гэтым «J_морс»–ам. Яны другі год запар не захацелі выйсьці на сцэну, бо... у залі другі год запар сядзеў Аляксандар Мілінкевіч. А з тым Мілінкевічам радасьць і гора... Фотарэпартаж **Юліі Дарашкевіч**.

# Рок–каранацыя ў здымках

У ноч з 25 на 26 лютага ў канцэртнай залі «Менск» адбылася «Рок-каранацыя». Рок-карону году атрымала гомельская група **«Rasta»**.

Сьмех і грэх з «J_морс»-ам. Яны другі год запар не захацелі выйсьці на сцэну, бо... у залі сядзеў Аляксандар Мілінкевіч. А з тым Мілінкевічам радасьць і гора.



**Ян Маўзэр (група «Tav.Mauzer») перамог у намінацыі «Выканаўца году»**

Радасьць — што палітык такога ўзроўню, ды ходзіць на такі канцэрт. А гора — бо страшна. То ж арганізатары нават тэлефанавалі ды ўпрошвалі: Вы ж, не дай Бог, не прыходзьце. А ён кажа: ды я не як палітык, а як чалавек сабе білет купіў. І такі прыйшоў. Але зьлітаваўся: на сцэну дарыць кветкі не выходзіў. Хоць авацыя была б яму гарантаваная, як і летась. Ясна хоць бы там, што пры называньні імёнаў кшталту «J_морс» ці «Смолава» ў залі разьліваўся дзікі сьвіст.

**J_морс традыцыйна праігнараваў Рок-Каранацыю...**



# Каранацыя застаецца маштабнаю і незалежнаю

Выканаўцы адлучаныя ад дзяржмэдыяў. Канцэрты забараняюцца. У «чорных сьпісах», распрацаваных ідэалягічным аддзелам Адміністрацыі прэзыдэнта і Мінкультам, ня толькі назвы рок-камандаў, але і канкрэтныя асобы. Арганізатарам канцэртаў раяць не пускаць на сцэну ня проста N.R.M., «Краму» ды «Палац», але і асобна Вольскага, Варашкевіча і Хаменку. У такіх умовах праходзіла сёлета «Рок-Каранацыя».

Казаць — не казаць, запрашаць — не запрашаць, — асабісты выбар арганізатара канцэрту. «Чорных сьпісаў» не існуе афіцыйна, але яны перадаюцца з вуснаў у вусны. Раней у тых вусных сьпісах былі гурты, што выступілі на мітынгу ў ліпені 2004 г. Потым сьпісы пачалі «пашырацца» на ўсю незалежную музыку.

Захочаш запрасіць Вольскага — будзь гатовы адстаяць права аднаго з самых папулярных музыкаў краіны выйсьці на сцэну.

Гэтая «Каранацыя» прайшла ў самых брутальных традыцыях рок-канцэртаў 80-х: назвы выканаўцаў ды іх тэксты ўзгадняліся, музыкі былі падзеленыя на «непажаданых» ды «астатніх». Дзеля справядлівасьці варта сказаць: прадусары цырымоніі прапіхнулі ўсё, што хацелі. Што дазволіла ім самацэнзура. І тут паўстала іншая праблема: нашым знаным музыкам ня надта і хацелася выступаць. Так, можна зразумець Ігара Варашкевіча: матэрыяльнай зацікаўленасьці ў гэтым ён ня мае (удзельнікам грошы ня плоцяцца), а дзеля ідэі ён наіграўся за 25 гадоў. Але, з другога боку, публіка патрабуе яго, Вольскага, Кулінковіча і не прызнае іншых аўтарытэтаў.

Аўдыторыя «Каранацыі» параўнальная з публікай на «Тутэйшых» у Купалаўскім тэатры. Кансэрватыўная і недаверлівая, але адукаваная і абазнаная. Запрашаючы на цырымонію небеларускамоўных музыкаў, сутыкаўся з пытаньнем: «Мы на нешта прэтэндуем? Там жа ўзнагароджваюць беларускамоўных». Так ёсьць, але зь іншай нагоды — музыка, выкананая на сваёй мове, мае большы попыт, яна самадастатковая і цікавая. Аднак акрамя мовы музыка мае яшчэ складнікі посьпеху. Уладальнікі галоўнай «Рок-Кароны» — гомельская Rasta — таму пацьверджаньне. Яны малавядомыя ў сваёй краіне, але сталіся адной з самых папулярных айчынных камандаў у сьвеце. Цяпер іх прызналі і тут, і яны паўней адчулі сваю беларускасьць. Хоць на іх выступе тая публіка і ламанулася ў гардэроб. На жаль, чакаючы пры канцы ўздыманьня бел-чырвона-белага сьцягу, мы забываемся на іншыя рэчы. Вартасьць і ўзаемапавагу, прынамсі.

У намінацыях цырымоніі сутыкнуліся два розныя музычныя сьветы. Калі і надалей Кроў хоць раз на год будзе стаяць на адной сцэне з «Городской тоской» (праект беларускіх прамоўтэраў Сярогі), Вайцюшкевіч з Rasta, а Ялфімаў з Zet — гэта будзе на карысьць беларускай музыцы. Толькі так могуць зьявіцца новыя героі. Учора гэта былі «ляпісы», «дзюбелі» ды «энэрэмы», а заўтра імі стануць «маўзэры», «Rasta» ды «бээны».

**Сяргей Будкін**

**P.S.** Мінулыя рок-каралі напраўду перад самай цырымоніяй прыхварэлі. У Кулінковіча быў грып, у Вольскага — бранхіт, у Пугача — ангіна.

**«Каралі» па намінацыях:**

«Рок-карона году»: гурт **«Rasta»**.

«Песьня году»: **«Гадзючнік»**, выканаўца **«N.R.M.»**

«Выканаўца году»: **Ян Маўзэр** (гурт «Tav.Mauzer»).

«Альбом году»: **«Босиком по мостовой»**, гурт **«J_морс»**.

«Праект году»: **«Прэм'ер Тузін 2006»**.

«Сьпеўная паэзія»: **Зьміцер Вайцюшкевіч** за альбомы **«Танга з ружай»** на вершы У.Някляева і **«Калыханкі»**.

«Рок-выканаўца году»: **Атмаравi** за альбом **«Романтика»**.

«Поп-выканаўца году»: група **«J_морс»** за альбом **«Босиком по мостовой»**.

«Пазытыўная музыка»: гурт **«Нагуаль»**, альбом **«У земли под юбкой»**.

«Традыцыя і сучаснасьць»: гурт **«Ur'ia»,** альбом **«Калі-чакра»**.

«Цяжкая музыка»: гурт **«Rasta»** за альбом **«The Age of Movement»**.

«Кліп году»: **«Apple Tea»** групы **«Apple Tea»** (рэж. Уладзімір Янкоўскі).

«Найлепшы хіп-хоп-выканаўца году»: гурт **«Городская тоска»** (Гомель) з альбомам **«С миром»**.

**Спэцыяльныя прызы:**

«Найлепшы замежны выканаўца беларускага рок-н-рола»: група **«Daimos»** (Смаленск).

«Надзея году» — група **ВИА «Визит»**

**...затое Мілінкевіч сярод гледачоў Каранацыі быў папулярны больш за «J_морс».**



Гурт B:N.






Пазытыўная музыка ад «Вірус Ліха».



«Праект году» — «Прэм’ер Тузін 2006».



У намінацыі «Сьпеўная паэзія» карону ўзяў Зьміцер Вайцюшкевіч.

Спэцыяльны прыз у намінацыі «Найлепшы замежны выканаўца беларускага рок-н-рола» атрымаў гурт «Daimos» са Смаленску.





# Цесна сядзелі, ды добра гаварылі

Вечарына найстарэйшай беларускай газэты праходзіла ў прыватнай хатцы ў сэрцы Маладэчна: адсюль пяць хвілінаў да райвыканкаму, да Цэнтральнай бібліятэкі (імя Максіма Багдановіча), да Музычнай вучэльні (імя Агінскага), да Клюбу чыгуначнікаў, да Палацу культуры. Толькі ні адзін з гэтых цёплых храмаў культуры ня здолеў прыняць стогадовую «Нашу Ніву»: як мы ня біліся з кіраўніцтвам установаў, ідэолягамі ад улады, вынік быў прадэманстраваны ў лісьце на імя Рэдакцыі яшчэ ў мінулым годзе («Страх адказвае», №36, 2006).

Але ж і ў невялічкую выстылую хаціну набілася 50 чалавек. Нават месца ўсім не хапіла, многія слухалі прамоўцаў стоячы.

Гэтую сустрэчу арганізоўвала маладая супольнасьць «За Маладэчна», у складзе якой прадстаўнікі розных грамадзкіх арганізацыяў (такіх, як Таварыства беларускай мовы), палітычных партыяў (АГП, БНФ), ініцыятываў, моладзевых аб'яднаньняў. Дзякуючы высілкам сяброў супольнасьці, у нежылой хаце стала ўтульна (віселі бел-чырвона-белыя балёнікі, гучала беларуская музыка, частавалі кавай, гарбатай і печывам), а таксама прысутныя займелі магчымасьць бясплатна атрымаць падарункі: кружэлкі зь фільмам «Плошча», музыкай «Песьні свабоды-1,2», запісамі падзеяў сакавіка-2006, беларускія каляндарыкі, значкі і бранзалеты кампаніі «За свабоду», чарговы (ужо сёмы) сьвежы нумар незалежнай газэты «За Маладэчна».

### Як тут ня ўбачыць сьцяг?

Падчас сваіх выступаў Андрэй Скурко, Валеры Булгакаў, Андрэй Дынько распавядалі, прэзэнтавалі кнігі, у тым ліку з сэрыі «Кнігарня «Наша Ніва». Тут жа адбылася першая ў краіне прэзэнтацыя новае кнігі «Беларусь за дзесяць падарожжаў», напісанай Андрэем Дыньком і Андрэем Скурко падчас вандровак па краіне.

Валеры Булгакаў — рэдактар «ARCHE» — эмацыйна расказваў пра вядомых гістарычных дзеячоў нашае краіны, рэклямуючы такім чынам выданьні, дзе пра іх ішла гаворка.

Андрэй Скурко — галоўны рэдактар «Нашай Нівы» — распавядаў пра цяперашні стан газэты, яе канцэпцыю і інтэрнэт-фармат.

Дазволю сабе не зусім звыклае параўнаньне. Тройца рэдактароў нагадала мне наш нацыянальны бел-чырвона-белы сьцяг: два «белыя» (гэты колер асацыюецца ў мяне з разважнасьцю, спакоем: менавіта так прамаўляюць Скурко і Дынько) Андрэі і рэактыўны, імпульсіўны, нейкі часам неадчэпны, «чырвоны» Булгакаў. Ды калі ўжо параўноўваць, дык я б назваў «Нашу Ніву» — белай, у той час як «ARCHE» — чырвоны. Вось і атрымоўваецца: колерава яны розныя, але разам прапагандуюць адны каштоўнасьці, змагаюцца за адну мэту. Як тут ня ўбачыш бел-чырвона-белы сьцяг?!

Аздобіў сьвята гурманаў беларускага слова выступ маладачанскіх аўтараўвыканаўцаў Лявона Тышкевіча і ягонага сына Яўгена. Дзякуючы іх песьням мерапрыемства ператварылася ў сапраўдную творчую вечарыну.

Прысутныя разам з бардам заклікалі:

...Узьлятай хутчэй, жаўрук, у неба!
І адтуль сьпявай цяпло вясны.
Узьлятай хутчэй, жаўрук, у неба!
І пра вясну мне вестку прынясі.
...Надакучыла зіма. Надакучыла...

### Цёплыя палацы і зімная сядзіба

У заключнай прамове Андрэй Дынько, сярод іншага, адзначыў: «Нягледзячы на тое, што мы сьвяткуем 100-годзьдзе «Нашай Нівы» не ў палацах, а вось у такіх халодных хатках, для нас нашмат важнейшы не памер сядзібы, а той дух, які пануе на гэткіх во імпрэзах». Напрыканцы, як ужо традыцыйна на сустрэчах, прысьвечаных «Нашай Ніве», усе прысутныя разам пад гітарны акампанэмэнт прасьпявалі гімн «Не загаснуць зоркі ў небе». Былі адмыслова надрукаваныя і раздадзеныя аркушы з тэкстам песьні.

Госьці расказвалі шмат, нязвыклае грамадзтва да такіх гасьцей (а то ўсё Лявонцьеў, Смолава, Каліна), пытаньняў задавала няшмат. Затое пасьля вечарыны сустрэча набыла іншы фармат.

### Рабіць сваю справу

Пасьля раздачы аўтографаў, набыцьця кніжак і невялічкае фотасэсіі грамада перасунулася бліжэй да століка з кавай і гарбатай. Вось там вечарына і атрымала ня менш цікавы працяг.

Пры падбухторваньні гасьцей зь Менску і Варшавы (дзе гэты год чытае лекцыі Валер Булгакаў), маладачанцы, якія засталіся на дыскусійную частку сустрэчы, прынялі выклік нашаніўцаў і бадзёра спрачаліся на розныя тэмы, якія хвалююць дэмакратычную супольнасьць краіны.

Прынцыповых разыходжаньняў у поглядах на агульнанацыянальную палітыку заўважна не было: нашаніўцы і маладачанцы выступаюць за адзінства дэмакратычных сілаў і кансалідацыю вакол Мілінкевіча. Хаця, як слушна адзначылі нашаніўцы, ня трэба зашмат зацыклівацца на асобе лідэра і на тым, што адбываецца ў сталіцы: важна кожнаму рабіць сваю невялікую, але карысную справу, набліжаючы перамогу *нашае* Беларусі.

**Юрась Бусел, Маладэчна**



KRYVICH

**Сьпявае Яўген Тышкевіч.**

# Чалавечае і хрысьціянскае:
## онлайн-канфэрэнцыя зь Пётрам Рудкоўскім

Філёзаф і багаслоў, аўтар кнігі «Паўстаньне Беларусі» адказваў на пытаньні чытачоў інтэрнэт–сайту «НН» у рэжыме рэальнага часу з 16:00 да 18:00. Прапануем Вашай увазе некаторыя пытаньні і адказы.

**— Пётра, як Вы ставіцеся да галадовак каталікоў, зьвязаных з высяленьнем польскіх ксяндзоў зь Беларусі? Да галадовак пратэстантаў за свой храм? У якім разе Вы самі пайшлі б на галадоўку? (nie_katalik)**

— Ці Вы маеце на ўвазе галадоўку ў Юрацішках і Ляздунах? Я перакананы, што гэта была цалкам апраўданая галадоўка, асабіста ня ведаю таго ксяндза зь Юрацішак, але веру, што ён шмат добрага зрабіў для сваіх авечак. Духоўна і малітоўна я падтрымліваў гэту галадоўку.

Што тычыцца галадоўкі пратэстантаў, то я быў перадусім становіча ўзрушаны іхным радыкалізмам і настойлівасьцю. Я б на галадоўку пайшоў, калі б мяне прымусіла сумленьне.

**— Як Вы лічыце, ці магчымая рэальная істотная падтрымка нейкімі сучаснымі каталіцкімі ордэнамі Ўніяцкай царквы ў Беларусі? Хіба нічога б зь яе сур'ёзнага не атрымалася, каб не езуіты ў Беларусі пры канцы XVI — XVII ст. Ці Вы маглі б выхаваць аднаго-двух Кунцэвічаў? Дзякуй за тое, што Вы пішаце. (Бірута Янкевіч)**

— На дадзены момант каталіцкія ордэны самі ходзяць на кастылях па няпростым беларускім грунце. Дык «істотнай падтрымкі» хіба ў найбліжэйшы час ані рэальна, ані гіпатэтычна ня будзе. А калі гаварыць пра «неістотную» падтрымку, то ёсьць. Вось у Віцебску доўгі час ужо ў дамініканскіх памяшканьнях жыве грэка-каталіцкі сьвятар са сваёй сям'ёй.

Не, выгадаваць Кунцэвічаў я б ня змог і не хацеў бы. У наш час патрэбны вялікія экумэнічныя дзеячы, а не Кунцэвічы. Бо чым займаліся б Кунцэвічы? Навяртаньнем праваслаўных на ўніяцтва? Катэгарычна супраць. Нам патрэбна перадусім духоўная еднасьць, а не інстытуцыйная.

**— Хвала Хрысту, вялебны ойча Пётра! Паходжу сам зь невялікай вёскі, стараюся бліжэй спазнаць Бога, самога сябе і іншых людзей. Адначасова зьяўляюся вялікім аматарам беларускай мовы. Стараюся стала размаўляць па-беларуску, тым самым заахвочваючы іншых. На жаль, не заўсёды спатыкаю разуменьне з боку каталікоў-аднаверцаў. У маёй вёсцы ўсе называюць мяне БНФаўцам. Крышку крыўдна, і душа баліць. Ці не параіце, як захаваць душэўную раўнавагу і любоў блізкіх, калі ўвесь час чуеш зь іхнага боку схаваную ўнутраную агрэсію? У нас вельмі лёгка стаць аб'ектам плётак, але цяжэй нашмат, калі яны закранаюць блізкіх. Ды і бацькі мяне зусім не разумеюць. Кажуць, навошта сам сабе ўскладняю жыцьцё, бунтуюся, калі маю што есьці. На парафіі ксёндз-паляк уводзіць паступова расейскую мову. Даволі добра яе вывучыў. Ды і беларусы-ксяндзы з суседніх парафіяў, відаць, таксама думаюць, што пабеларуску можна толькі з быдлам ў хляве размаўляць. Можа, параіце, як не зграшацца, бо калі духоўныя лідэры ў малым выбіраюць лёгкі шлях (г.зн. сьвядома альбо не адмаўляюцца ад беларускай мовы на карысьць русіфікацыі), то ці ў вялікім іх варта слухаць? Дзякуй, і жадаю Божага Шчасьця! (Siabruk)**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

— Дарагі Сябрук! Мяркую, вы даволі малады чалавек. У такім разе перадусім памятайце, што ў вас яшчэ ўсё наперадзе. Вас чакаюць вялікія і важныя справы, а цяперашнія выпрабаваньні — гэта важны этап у вашым жыцьці, які мае загартаваць вас. Такім чынам, застаньцеся вернымі свайму сумленьню і нічога ня бойцеся. Шукайце больш асабістага кантакту з Богам. Ён вам скажа, што рабіць.

Уявіце, што дзесь 12—13 гадоў таму я быў дакладна ў такой самай сытуацыі, што і вы. Ніхто не разумеў маёй любасьці да Беларусі і беларускасьці, уключна з маімі бацькамі і дзяўчынай. І страшэнна балюча было, калі ксёндз пробашч выдумляў абсурдальныя прэтэксты, каб адмовіць маёй просьбе зрабіць хоць адно чытаньне, хоць раз у год (!) па-беларуску. Усё гэта, відавочна, трэ' было перажыць і перажаваць. Але благаслаўлёны той, хто гарыць!

**Пётра Рудкоўскі**

нарадзіўся ў 1978 г. у Канвэлішках (Воранаўскі р–н Гарадзенскай вобласьці). Скончыў Ягелонскі ўнівэрсытэт. Сталы аўтар «НН» і часопіса ARCHE. Ляўрэат прэміі ARCHE «За сумленнае слова» (2005).

**— Вы багата пішаце пра палітыку. Ці Пётра Рудкоўскі, які піша пра палітыку, і Пётра Рудкоўскі, які прысьвяціў жыцьцё Богу, не канфліктуюць? (СБ)**

— А што значыць «прысьвяціць жыцьцё Богу»? Некаторым здаецца, што служыць Богу — значыць замкнуцца, адасобіцца і сьпяваць бясконца басам «Господу помолімся». Але пачытайце сьвятую гісторыю. Майсей — той, хто пайшоў на службу да мадыяскага сьвятара. У пэўны момант перажывае тэафанію. Бог яму кажа: «Майсей, глядзі, народ мой церпіць. Ідзі і выведзі яго з эгіпецкага рабства». Пачытайце кнігі прарокаў Ісаі, Ерэміі, іншых мудрацоў.

І любому з нас, веруючых, Бог можа сказаць: «Ідзі і дзейнічай!» І мне Ён сказаў: «Пётра, чаго ты тут усё кленчыш. Адкрый вочы й паглядзі: майму народу дрэнна. Што ты можаш зрабіць для яго??»

Ну і што я магу Богу адказаць? Калі я прысьвяціў жыцьцё Богу, значыць, мушу Яго слухацца, ці не? Калі Бог распаліў ува мне пэўныя ідэі і даў якісь талент, дык я магу толькі тое зрабіць, што буду верным гэтым ідэям і нейк служыць сваім талентам.

Так што ўва мне самім «палітыка» і «вера» гарманізуюць у найбольшай ступені.

Хоць тут ёсьць таксама момант напружаньня, прычым досыць сур'ёзнага напружаньня. Многія ўспрымаюць мае публікацыі і выступы як выступы прадстаўніка Касьцёлу. А я не магу функцыянаваць у рамках «афіцыйнасьці». Я пераважна гавару тое, што ў сэрцы, я не рэтрансьлюю тое, што біскупы ці ксяндзы сказалі ці пастанавілі. У сацыялёгіі ёсьць такі панятак — «карпарацыйная этыка». Вось жа, я неаднаразова парушаў гэту «карпарацыйную этыку», крытыкуючы ці то ксяндзоў, ці то герархаў. Гэта наводзіць мяне на досыць спэктакулярныя думкі — калі я не магу функцыянаваць у рамках «афіцыйнасьці», ці ня лепш было б стаць звыклым хрысьціянінам, каб не ствараць пэўных нязручнасьцяў для Касьцёлу? У гэтым чакаю якогась подыху, якойсьці падказкі ад Бога. Бо такая дылема сапраўды ёсьць.

**— Брат Пётар, а вось скажыце так па-людзку, навошта чалавеку быць хрысьціянінам? Другое пытаньне — як ім быць? (louka)**

— Некаторыя філёзафы кажуць: chrestianitas et humanitas convertuntur. Чалавечае і хрысьціянскае — паняткі ўзаемазамяняльныя. Хрыстос — Бог-чалавек, які дапамагае нам быць *поўным чалавекам*.

Быць хрысьціянінам — гэта перадусім любіць.

**— Брат Пётра, ці выбіраецца беларускі Касьцёл паціху з польскасьці, найперш на Гарадзеншчыне, і ці не зьмяняе часам гэтую пальшчызну расейшчына? Якое Вашае стаўленьне да высылкі польскіх ксяндзоў зь Беларусі і ўвогуле да іх прысутнасьці тут? Як цяпер у беларускім Касьцёле з паклікаными? Як прывесьці да Хрыста блізкага табе чалавека, душа якога вытраўлена атэістычнай прапагандай, без маральнага гвалту над гэтым чалавекам? (Ігар)**

— Што тычыцца касьцёлу на Гарадзеншчыне, дык Вы вельмі добра акрэсьлілі: Касьцёл выбіраецца з польскасьці паціху. Часам з розных прычын на месца пальшчызны прыходзіць расейшчына, але я ня думаю, што гэта дамінуючая тэндэнцыя. Што тычыцца ўсіх астатніх дыяцэзій, апрача Гарадзенскай, дык там беларускамоўная опцыя даволі выразная і хіба незваротная.

Стаўленьне да высылкі польскіх ксяндзоў вельмі неадназначнае. Прынамсі некаторыя зь іх недалюблівалі (мякка кажучы) беларускасьць. Хоць з гледзішча духоўнага адраджэньня думаю, што прыносілі больш карысьці, чым шкоды.

З пакліканьнямі ў беларускім Касьцёле горш, чым у Польшчы, але значна лепш, чым у Францыі, Нямеччыне, Ірляндыі або ў іншых краінах Заходняй Эўропы.

«Прасіце Госпада, каб паслаў работнікаў на жніво сваё». Перадусім малітвай і цярплівасьцю. Галоўнае правіла — рабіць гэта ненавязьліва, але час ад часу словам і прыкладам паказваць пэрспэктыўнасьць Хрыстовага Эвангельля.

**— Ваш ідэал сьвятарскага служэньня? (Ганна)**

— Перадусім сьвятой памяці ксёндз Апалінар Зубялевіч, пробашч Канвэліскай парафіі, які мяне хрысьціў. Сьвяты чалавек. І ёсьць таксама шмат іншых сьвятароў, у тым ліку і ў Віцебскай дыяцэзіі, якія ў цяжкіх умовах будуюць касьцёлы, навучаюць людзей і служаць Беларусі. Я не дарастаю да іх ўзроўню.

**— Пётра, ведаю, што Вы сёлета працуеце ў Віцебску, і што Вы ўпершыню сутыкнуліся з Усходняй Беларусьсю. Як гэтая праца на ўсходзе Беларусі зьмяніла Вашыя бачаньні? Што ва Ўсходняй Беларусі Вас найбольш уражвае? Ці маем мы дзьве Беларусі, ці іх болей? Вельмі важнае адно з пытаньняў, зададзеных вышэй: як Вы ставіцеся да мэтадаў галадоўкі, і ў якім разе на гэта варта ісьці? (Андрэй)**

— Я пераканаўся, што падзел на Ўсходнюю і Заходнюю Беларусь намнога больш лагодны, чым падзел на Ўсходнюю і Заходнюю Ўкраіну. Віцебск мае яшчэ з часоў царскай Расеі дысыдэнцкія традыцыі. Калі я ініцыяваў студэнцкія сустрэчы, то на адной зь першых сустрэч зрабіў апытаньне наконт пажаданай мовы на спатканьнях. І што вы думаеце? Большасьць гэтых «усходнікаў» аддала перавагу беларускай мове. Беларусь дыфэрэнцыяваная і ідэалягічна ды палітычна падзеленая, але не настолькі, каб можна было гаварыць пра «дзьве ці болей» Беларусяў. Яна адна, а давайце дапамагаць беларусам яшчэ больш наблізіцца адзін да аднаго.

Наконт галадоўкі я хіба ўжо адказаў і магу толькі ўдакладніць, што на галадоўку трэба ісьці толькі тады, калі кліча сумленьне. Нельга ісьці зь якіхсьці палітычных калькуляцый.

**— Што Вы думаеце пра партугальскі рэфэрэндум аб легалізацыі абортаў? (janak)**

— Вельмі балюча ўспрымаю такога тыпу рэфэрэндумы, балюча зь дзьвюх прычынаў. Па-першае, гэта адна з праяваў лібэральнай дэмакратыі, якую ўсё ж такі паважаю. Зь іншага боку, гэта хіба той прыклад, калі адбываецца «самаатручваньне адкрытага грамадзтва», як казаў філёзаф Лешак Калакоўскі. Жыцьцё чалавека ад зачацьця і да канца — сьвятое.

Тым ня менш я б асьцерагаўся дэманізацыі Эўропы. Чалавецтва цягам усёй сваёй гісторыі пазначана рознымі грахамі, і, тым ня менш, нельга пасьпешліва акрэсьліваць тую ці іншую частку чалавецтва «Варотамі Пекла». Тэндэнцыі ў Эўропе, хутчэй, несуцяшальныя ў гэтым пляне. Думаю, што ў будучым будзе, на жаль, нарастаць тэндэнцыя дрэнна зразуметай «лібэралізацыі». Але гэта выклік для тых, каму важныя духоўныя каштоўнасьці, а выйсьці насустрач гэтаму выкліку немагчыма, дэманізуючы Заходнюю Эўропу.

**— Як Вы ставіцеся да кнігі Паўла Севярынца «Нацыянальная ідэя. Фэнамэналёгія Беларусі» з канфэсійнага й тэалягічнага гледзішча? (tulyaha)**

— Я вельмі ўдзячны Паўлу Севярынцу, што ён спрычыніўся да наданьня хрысьціянскага характару нацыянальнаму адраджэньню, інакш кажучы, ён дазволіў Хрысту ўвайсьці ў нашу культуру і ў наша жыцьцё. Але думаю ўсё ж, што ягоная публіцыстыка занадта перанасычаная рэлігійнай фразэалёгіяй. Калі такой фразэалёгіі зашмат, то яна баналізуецца. Ста-

# ...онлайн-канфэрэнцыя зь Пётрам Рудкоўскім

новіцца чымсьці звыклым і звычайным. Хрысьціянства — гэта фэрмэнт, а фэрмэнту не павінна быць зашмат. Дастаткова крышачку.

**— Біблію па-беларуску ў якім перакладзе Вы карыстаецеся? (Рота Ч.А.)**

— Мне вельмі падабаецца пераклад Біблійных чытаньняў, зроблены каталіцкай літургічнай камісіяй (хоць гэта і існуе ў студыйнай вэрсіі — пакуль што), на другім месцы — пераклад Сёмухі, на 3-м — а.Чарняўскага і г.д. Але калі мэдытую над Біблійным тэкстам, то чамусьці мне больш пасуе расейскі пераклад або лацінскі, ну і, канечне, грэцкія арыгіналы.

**— Пахвалёны Езус Хрыстус. Шмат хто з ксяндзоў паходжаньня беларускага, як прыклад — цяперашні дэкан Астравецкага раёну родам з Мастоў. Але той зьвёў у нівошта беларускую імшу ў самым Астраўцы — паставіў у невыгодны час, і сама імша вядзецца на дзьвюх мовах, часам здаецца пенкне ад напругі, як стараецца з «варшаўскім акцэнтам»\penknie ad napruhi, jak strajecca z «varshauskim akcentam». Хоць беларускай мовай валодае дасканала. Што гэта, хіба невуцтва ўласнае? Ці рука Кашкевіча? (Vavzhyniec)**

— Разумею Ваш боль і абурэньне. Я ўжо неаднойчы пісаў пра «польскае пытаньне» ў Гарадзенскай дыяцэзіі. Не, гэта не «рука Кашкевіча», а папросту заганны этас, устойлівы кансэнсус пасярод большасьці каталіцкага духавенства на Гарадзеншчыне наконт таго, што трэба любой цаной захаваць польскасьць у касьцёлах. І захоўваюць яны гэту польскасьць такім мэтадам, які адпавядае іхняй асабістай культуры — мэтадам прыніжэньня беларускай культуры.

**— Раскажэце падрабязна пра сябе. Адкуль Вы, і як Вы дайшлі да такога жыцьця (гэта значыць, манаскага паслушэнства, як мы чулі, і пісаньня па-беларуску)? (Ёпс)**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Пётра Рудкоўскі ў рэдакцыі «НН».

— Я зь Віленшчыны, нарадзіўся ў Канвэлішках (гэта беларускі бок). Да «паслушэнства» дайшоў паступова. Хацеў нейкіх ідэалаў. Гэтае хаценьне павяло і павяло, вось у выніку я й дайшоў «да такога жыцьця». «Паслушэнства» для мяне — гэта ўменьне слухаць і чуць, як сама этымалёгія слова гаворыць У гэтым сэнсе паслушэнства — гэта адзін з ідэалаў. Але часам паслушэнства атаесамляецца зь безумоўным падпарадкаваньнем чыйсьці волі. Калі так разумець паслушэнства, то тады я вельмі непаслухмяны. Унутраная свабода і незалежнасьць — арганічна важныя для мяне.

Беларускасьць я сустрэў у сваёй душы. У дзяцінстве я пісаў вершы і прозу (для вузкага кола сяброў). Спачатку па-польску (напісаў дзесьці 800 старонак усяго). Потым па-расейску. А потым пад нейкім дзіўным натхненьнем напісаў нешта па-беларуску. І тады я адкрыў, што ў гэты момант не пішу, а дыхаю. Ясна, што тое, што я тады пісаў па-беларуску, ня мае ніякай мастацкай вартасьці, але важна тое, што я тады ўсьвядоміў, што ў прасторы беларускае мовы я пачуваюся як рыба ў вадзе. А ў прасторы якой-кольвечы іншай мовы — як рыба ў кампоце.

**— Ці прыгожыя Канвэлішкі, у якіх нарадзіліся? Бо назва вельмі прыгожая. Адкуль яна пайшла? Хто Вашыя бацькі? Ці ёсьць браты, сёстры? (Тт)**

— Ох, як быццам бы і нічога асаблівага няма ў гэтых Канвэлішках, а так люблю я іх, што здаюцца найпрыгажэйшымі ў сьвеце! Назва Konveliskes, літоўская, канечне ж, хоць у літоўскіх крыніцах можна стрэць Kauleliskes (немавед чаму, бо kaule — гэта косьць, а якія там у нас косьці). А «Канвэлішкі» паходзяць, найвідавочней, ад «канваліяў», ландышаў, знача. Бацькі мае — Марыя і Ян, былыя рабочыя, цяпер пэнсіянэры. Рудкоўскія — гэта найвідавочней зьбяднелая шляхта, якая на момант пачатку XX ст. ужо толькі служыла то тут, то там у польскіх паноў. Бацькі нарадзіліся яшчэ ў II Рэчы Паспалітай. З-за вайны не змаглі атрымаць нават базавай адукацыі. Скончылі па тры клясы. Але іх нераскрыты патэнцыял часам выходзіць наверх, асабліва ў маці. Яна на працягу двух дзён можа напісаць цэлы сшытак вершыкаў на выпадак, калі трэба павіншаваць ксяндза зь імянінамі або ўрачыста стрэць біскупа. Вершыкаў простага, канечне, зьместу, але з рытмам і рыфмай амаль бездакорнай. Ёсьць адзін брат, першародны сын маіх бацькоў, тры сястры і я, «замыкаючы лона». Я нарадзіўся позна, калі бацькам было ўжо за сорак.

**— Шаноўны Пятро, ці не здаецца Вам, што ў стаўленьні нацыянальнага асяродзьдзя да Касьцёлу і наадварот існуе крыху анахранічная дыстанцыя і шэраг перасудаў. У прынцыпе Касьцёл павольна, але стабільна і незваротна беларусізуецца, наша мова фактычна становіцца літургічнай, што надае ёй зусім іншае вымярэньне, сацыяльнае вучэньне Касьцёлу ўвасабляе найлепшыя грамадзянскія каштоўнасьці. Карацей, ці ня варта Касьцёлу і грамадзянскай супольнасьці больш цаніць адно аднаго? (Сьцяпан)**

— Учора я выступаў на канфэрэнцыі «Беларусь і Большая Эўропа» з дакладам на тэму «Ролі рэлігіі ў геапалітычным самавызначэньні беларусаў». Тыя пытаньні і рэплікі, якія прагучалі пасьля дакладаў, здаецца, пацьвярджаюць Вашую тэзу шэрагу перасудаў. Але хацеў бы тоесёе ўдакладніць у тым, што Вы кажаце. Адносна вялікая ступень уплыву (хоць, можа, і недастатковая) назіраецца ў сфэры нацыянальнага адраджэньня. Намнога меншая ступень уплыву ў справе пабудовы грамадзянскай супольнасьці. Сацыяльнае вучэньне Касьцёлу (і Царквы) сапраўды ёсьць, і яно даволі прадуманае і адаптаванае да сучаснасьці. Але пакуль што ў Беларусі яно толькі на паперы. Духоўныя ўлады — як Праваслаўнай, так і Каталіцкай царкваў, — ня маюць дастатковай маральнай кандыцыі і адпаведных кадраў, каб прасоўваць гэтае сацыяльнае вучэньне. Так, варта Касьцёлу і грамадзянскай супольнасьці больш цаніць адзін аднаго.

КРЫТЫЧНЫ НАСТРОЙ

# Пазбавіцца комплексаў

Некаторыя беларускія чытачы, у сьвядомасьці якіх моцна замацавалася схема «правінцыя—мэтраполія», маюць звычку параўноўваць нацыянальную літаратуру з расейскай. Піша **Павал Абрамовіч**.

Альбо з ангельскай, францускай, гішпанскай, польскай — хто якую чытае. Такія чытачы з мазахісцкім задавальненьнем (параўнаньне, вядома, будзе зроблена імі не на карысьць роднай літаратуры) параўноўваюць мастацкую праблематыку кніг, сюжэты, вобразы галоўных герояў твораў, наклады і якасьць паліграфіі… І нават саміх аўтараў — Ігара Бабкова зь Віктарам Пялевіным, Югасю Каляду з Даротай Маслоўскай[1] і г.д.

Ёсьць і іншая катэгорыя людзей з падобнымі хібамі мысьленьня (інакш гэта не назавеш): яны нічога ня ведаюць пра сучасную беларускую (украінскую, літоўскую, etc.) мастацкую літаратуру, але цьвёрда перакананыя, што яна значна саступае той жа расейскай. Да таго ж, калі такім людзям распавядаеш, у прыватнасьці, пра пераклады Сэрвантэса і Рабле, якія ты пабачыў на ўкраінскім стэндзе міжнароднай кніжнай выставы ў Менску, іх перасмыкае, бо пераклады зь «вялікіх» літаратур на ўкраінскую (як і на беларускую) у іхнім уяўленьні таксама саступаюць!

Дадзеная праблема актуальная ня толькі для Беларусі, але і для ўсіх посткаляніяльных краін. Каб пераканацца ў гэтым, дастаткова прачытаць артыкул Марціна Левіна, літаратурнага аглядальніка «Глоб энд Мэйл» (Таронта), «Калі зьявілася сучасная канадзкая літаратура?» (Иностранная литература. 2006. № 11). У ім М.Левін піша, што да 70-х гадоў мінулага стагодзьдзя многія ўспрымалі канадзкую літаратуру як «каляніяльны дадатак да брытанскай літаратуры». У лік гэтых «многіх» уваходзіў «пачынальнік» канадзкай паэзіі сэр Чарльз Дж.Д.Робэртс і новашатляндзкі гумарыст Томас Чандлер Галібэртан.

Як выяўляецца, праблемаў з самаацэнкай хапае і ў тых, хто па праву можа назваць расейскую, гішпанскую ці нейкую іншую, «вялікую» літаратуру роднай. Кацярына Барабаш, аглядальнік аднаго з уплывовых расейскіх выданьняў, у артыкуле «Для ўнутранага карыстаньня» (Независимая газета. 2006. 10 кастрычніка) даводзіць, што «расейская культура пасьпяхова і весела варыцца ў сваім соку, зь пенай ля роту, аднак, мусіруючы міт аб уласным усясьветным прызнаньні», і з сарказмам прапаноўвае адсьвяткаваць у 2007 г. своеасаблівы юбілей — «дваццаць гадоў нашай непрысутнасьці ў полі зроку Нобэлеўскага камітэту».

Давайце пазбаўляцца комплексаў, але не паглыбляць іх. Дзеля гэтага трэба проста чытаць мастацкія творы, свае і замежныя, і атрымліваць асалоду ад гэтага захапляльнага працэсу. Тым жа, хто *ня можа не параўноўваць*, варта нагадаць: у аркестры пад назвай «сусьветная літаратура» вагу і каштоўнасьць мае кожны інструмэнт.

[1] Дарота Маслоўская (нар. 1983) — польская пісьменьніца, аўтарка раману «Польска-руская вайна пад бела-чырвоным сьцягам» (2002), перакладзенага на 10 моваў сьвету. — ***П.А.***

КАЛЯНДАР

# Сакавік

**4** — 225 гадоў таму (1782) нарадзіўся Казімір Ельскі, скульптар, першы прафэсар скульптуры на Беларусі.

**4** — Пурым у габрэяў.

**4** — 75 гадоў таму (1932—2007) у Пінску нарадзіўся Рышард Капусьцінскі, польскі пісьменьнік і журналіст.

**11** — Дзень аднаўленьня незалежнасьці Літвы.

**14** — Міжнароднае матэматычнае сьвята «дзень Пі».

**15** — 75 гадоў з дня нараджэньня польскага кінарэжысэра Ежы Хофмана (1932).

**15** — Міжнародны дзень супраць жорсткасьці паліцыі.

**15** — Нацыянальнае сьвята Вугоршчыны.

**15** — Міжнародны дзень правоў пакупніка.

**16** — 300 гадоў таму (1707) шляхам узьяднаньня каралеўстваў Англіі і Шатляндыі было ўтворана Каралеўства Вялікабрытанія.

**18** — 75 гадоў з дня нараджэньня Эрнста Сабілы, постаці беларускага дысыдэнцкага руху, пастара Беларускай Эвангельскай Царквы (1932).

**18** — 75 гадоў таму (1932) нарадзіўся Джон Апдайк, амэрыканскі аўтар.

**22** — 175 гадоў з дня сьмерці нямецкага пісьменьніка Ёгана Вольфганга Гётэ (1832).

**25** — Дзень Волі.

**25** — Зьвеставаньне ў каталікоў.

**25** — 50 гадоў таму (1957) заснаваная Эўрапейская Эканамічная Супольнасьць (Заходняя Нямеччына, Францыя, Італія, Бэльгія, Нідэрлянды, Люксэмбург).

**25** — Дзень незалежнасьці Грэцыі.

**26** — 75 гадоў таму (1932) памёр біскуп Зыгмунт Лазінскі, беларускі каталіцкі рэлігійны дзеяч, першы біскуп Пінскае дыяцэзіі.

**26** — Дзень незалежнасьці Бангладэш.

**27** — Міжнародны дзень тэатру.

**31** — Маўлід аль-Набі (дзень народзінаў прарока Мухамада).



PHOTO.BYMEDIA.NET

# Тры весткі пра Суціна і Сьмілавічы

У траўні ў Сьмілавічах плянуюць адкрыць музэй Хаіма Суціна. Ягонае палатно прададзенае за рэкордны кошт. На ягонай радзіме спалілі мусульманскую сьвятыню. Піша **Сяргей Харэўскі**.

Сьвет абляцела вестка пра тое, што чарговы аўкцыён Sotheby's у Лёндане скончыўся сэнсацыяй: палатно нашага земляка Хаіма Суціна «Партрэт мужчыны ў чырвоным шаліку» прададзены за рэкордныя грошы — $17,32 млн. Але ня гэта было галоўнай неспадзяванкаю. Непараўнальна меншыя сумы далі пакупнікі за клясыкаў францускага імпрэсіянізму Агюста Рэнуара (6,8 млн фунтаў), Эдгара Дэга (4,16 млн), Клёда Манэ (4 млн), Альфрэда Сісьлея й фавіста Рауля Дзюфі.

На радзіме Суціна, у мястэчку Сьмілавічы, пры дапамозе Нацыянальнай камісіі ў справах ЮНЭСКО ў Беларусі ў траўні мае адкрыцца ягоны музэй. Яго плянуюць разьмясьціць у адным з пакояў шыкоўнага палацу Манюшкаў-Ваньковічаў, дзе цяпер месьціцца «аграрны каледж». У экспазыцыі «Прастора Хаіма Суціна» плянуецца адрадзіць колішні сьвет мястэчка, у якім нарадзіўся на ўвесь сьвет вядомы жывапісец. А ў кавярні, што плянуецца стварыць тутсама, аздоба будзе ў духу Парыжу 20-х гадоў XX ст., з рэпрадукцыямі палотнаў мастака й рэчамі стогадовае даўніны. І, як для нашай краіны, гэта ня меншая сэнсацыя за вынікі лёнданскага аўкцыёну.

Сапраўдны дом, у якім жыла сям'я Суцінаў, пайшоў дымам падчас апошняе вайны. Цяпер той пляц забудаваны. Але на старасьвецкіх жыдоўскіх могілках захаваліся пахаваньні ягоных родных. У Беларусі дагэтуль жыве пляменьніца славутага мастака. Таму шанцы прыўлашчыць яшчэ адно бліскучае імя ў Беларусі ёсьць. Што праўда, наўрад ці сам Хаім Суцін мог бы сабе ўявіць, што прысьвечаны яму музэй будзе месьціцца ў шыкоўным палацы нашых арыстакратаў. Арганізатарамі музэйнае экспазыцыі й кавярні ў Сьмілавічах выступаюць ініцыятыўная група «па стварэньні ўстойлівага разьвіцьця Сьмілавічаў» ды Цэнтар візуальных мастацтваў і мэдыяў Дзяржаўнага інстытуту кіраваньня й сацыяльных тэхналёгіяў Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту!

Пра тое, што гэты палац зьвязаны з радамі Агінскіх, Манюшкаў, Ваньковічаў, імёнамі мастакоў Язэпа Пешкі й Напалеона Орды, паэтаў Янкі Купалы, Якуба Коласа, арганізатары пакуль не згадалі.

Прыгожы палац быў збудаваны ў модным на пачатку XIX ст. стылі нэаготыкі з выкарыстаньнем старажытных муроў замку Агінскіх. Дзьве ягоныя сьпічастыя вежы нібы рэхам паўтаралі абрысы шыкоўнага тутэйшага касьцёлу пры калегіюме місіянэраў. Адначасна каля яго быў створаны парк. Цяпер пра яго нагадваюць старадаўнія ліпавыя прысады. Паўзь іх сьцяжына ідзе да пекнага берагу Волмы, над якім уздыбіліся старажытныя замкавыя равы. Палац захоўваў карцінную галерэю, бібліятэку, архівы Агінскіх, Манюшак, Ваньковічаў. У яго «старым» корпусе былі бальная заля, більярдны і спальныя пакоі. Засталіся да сёньня ў большменш прыдатным стане толькі рэшты «новага корпусу», хоць і ў панявечаным выглядзе — дабудаваны нягеглы тамбур пры ўваходзе, вокны замененыя на сучасныя суцэльнашкляныя. Раней перад палацам быў шыкоўны батанічны сад, створаны выбітным батанікам Андрэем Сьнядэцкім. Зараз большая частка колішняга саду брутальна занятая гмахам «Завочнага сельскагас-



**Хаім Суцін.**





**Сьмілавіцкі палац у пачатку XX ст (уверсе) і сёньня (унізе).**

падарчага каледжу».

Хаім Суцін быў дзясятым дзіцём у надзвычай беднай сям'і габрэйскага шаўца. Ня маючы грошай на праезд, ён пешкі хадзіў да Менску, дзе й атрымаў сваю першую навуку… У 1907 г., ва ўзросьце 14 гадоў, Суцін змушаны быў працаваць. Яму пашэнціла знайсьці месца памочніка рэтушэра ў фотаатэлье. Напаўгаладнае дзяцінства запала ў ягоную душу назаўжды.

Але Сьмілавічы часоў маленства Суціна былі зусім ня цёмным і брудным мястэчкам, як гэта часам настойліва даводзяць. Наадварот! Гэта было вельмі рамантычнае места над Волмаю са слаўнай гісторыяй. Апроч шыкоўнага замку з палацам, выдатнага калегіюму з касьцёлам, трох цэркваў, сынагогаў і мячэту, была ў Сьмілавічах і вялікая пажарная каланча, што спрэс была размаляваная й скрэмзаная на ўсіх мовах. На яе ўзьбіраліся ці ня ўсе тутэйшыя хлапчукі — беларусы, габрэі, татары. Зь яе яны бачылі ўсё старадаўняе мястэчка. А тое, што хавалася за смугою далягляду, за сінім полем і чорным лесам, уяўлялася небясьпечным і недасягальным.

Тутсама, у родных Сьмілавічах, Хаіма, які краў спакваля ў бацькоўскай хаце ўсё, на што можна было прыдбаць каляровыя алоўкі, фарбы ці паперу, жорстка зьбілі. Не за крадзеж. А за тое, што ён наважыўся намаляваць самога рабіна. Сыны сьвятара-цемрашала патаўклі падлетка да паўсьмерці. Каб залагодзіць справу, рабін змушаны быў аплаціць выправу па навуку ў Вільню. Далі дваццаць пяць рублёў. Гэтак коштам уласнае крыві Хаім Суцін станавіўся мастаком. Невыпадкова той чырвоны, крывавы колер абавязкова сачыцца з усіх ягоных палотнаў.

У вайну згарэла славутая пажарная каланча, яшчэ да вайны былі разрабаваныя сьмілавіцкія храмы, а вялізарны палац доўгі час быў Домам творчасьці для пісьменьнікаў. Па вайне тут была зусім іншая гісторыя. Ад колішняе велічы й хараства, у якіх вырас Хаім Суцін, сёньня тут амаль нічога няма. Апроч магілаў…



**Карціну Х.Суціна «Партрэт мужчыны ў чырвоным шаліку» прадалі за $17,32 млн.**

**P.S.** На пачатку лютага са Сьмілавічаў прыйшла яшчэ адна вестка, што ў іншых краёх была б першай сэнсацыяй, — пры нявысьветленых абставінах згарэў вядомы тутэйшы мячэт. Стары драўляны будынак у 1997 г. быў абмураваны. Грошы на будаўніцтва мячэту фундавала сястра караля Кувэйту Нурыя...

Цяпер закурэлыя сьцены спаленай мусульманскай бажніцы, руіны некалі шыкоўнага палацавага комплексу ды ўзоры калгаснага будаўніцтва маюць сузіраць наведнікі кавярні «а ля Парыж» на радзіме геніяльнага мастака. Будзе над чым падумаць і Нацыянальнай камісіі ЮНЭСКО, і Цэнтру візуальных мастацтваў… Зрэшты, і гасьцям таксама.

## АНДРУСЬ ХРАПАВІЦКІ

СТУДЭНТЫ І POGO

готы, эмо, панкі, падлеткі, цыцкі, пражэктары, піва,
дыскатэкі, бары, канцэрты, забароненая літаратура,
час бяжыць так імкліва, асабліва падчас адрыву,
выбухныя скокі, стрэлы з гумы і зусім не амура.

ты мяне не кахаеш, але мы разам, і нам так неістотна,
што пра нас думаюць тыя, што па іншы бок агароджы,
я захоплены тым, што сёньня мы памром несамотныя,
але заўтра будзем ізноў нашымі бацькамі народжаныя.

мільгацяць сырэны, ногі ў ботах тупаюць па асфальту,
але з намі анёлы крыламі белымі б’юць, палаюць паходні,
камянямі таксама робіцца дэмакратыя, часам варта
дзеля супольнага дабрабыту дзьвінуць у нечую морду.

ты гопаеш на мяне, я скачу на цябе, мы зьліваемся ў экстазе
крыві і зламаных кантаў, дэкартаў і іншых частак мінулага,
калі хочаш свабоды, не чакай на ўдар, сам бі адразу,
не чакай на мой стрэл, а сам выпусьці кулю.

раскіданыя па падлозе адно на адным у шчасьці,
на сцэне п’яныя музыкі і зламаныя ўшчэнт інструмэнты,
нехта кахаецца, кусаючыся па-сабачы ў пякельнай жарсьці,
выкладчык ківае галавам, уздыхае самотна: «Студэнты»...

## MANN KURT

САРМАЦКІЯ ХАЙКУ

***
Сыру ў краме куплю. Мазісты, як звычайна.
Падсумоўваючы
Незваротныя страты, выдзелю галоўную:
Дзіркі.

***
Конік заржаў: «Гуігнм!» на стаенцы, а я
Згадваю Лемюэля і спрабую перакласьці
Yahoo — атрымліваецца «люцц».

***
У «Мінскай праўдзе» гумарэску чытаю.
Побытавая глеба, як Антэя, ты нас
Моцна трымаеш.

## МІКАЛАЙ ПЕТРУШЭНКА

***

Бліз гасьцінца ў вёсцы Ляўкова
Надмагільныя пліты ляжаць...
Па-над сьвежай магілай вясковай
Маці й жонка зайшліся, крычаць:

«Мой сыночак, навошта раптоўна
Ты пайшоў ад любімай сям’і?
Ты навошта, сыночак, гвалтоўна
Сам падрэзаў свае карані?

Мой каханы, навошта так рана
Ты пакінуў навекі мяне?
Ты навошта, мой любы, на ганку,
Сам пяцельку прыладзіў сабе?..»

...За жалобным сталом аднагодкі
П’юць паўнюткія шклянкі зь віном.
У бутэльцы з акцызнай галоўкай
Затаілася сьмерць за вуглом.

*Талачын*




**23 лютага ў Менску прайшоў турнір па тайляндзкім боксе. Адным зь пяці двубояў быў дзявочы.**




Аднойчы Капітан Танака знайшоў прыгожую марскую ракавіну. І захацелася яму накіравацца ў марское падарожжа.





Капітан Танака паклікаў сваіх сяброў.


















Сябры паплылі па рацэ да мора.




Http://www.tanakaland.org

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Бабілёнская вежа

**Бабілён** (Babel)

ЗША — Мэксыка — Францыя, 2006, каляровы, 142 хв.

**Рэжысэр:** Аляхандра Гансалес Іньярыту

**Ролі выконваюць:** Брэд Піт, Кейт Бланшэт, Гаэль Гарсія Бэрналь, Кашы Якуса, Адрыяна Бараза, Рынка Кікучы, Гарыет Ўолтэр, Трэвар Марцін

**Жанр:** Драма

**Адзнака:** 8 (з 10)

7 намінацый на «Оскара», узнагарода за найлепшы саўндтрэк.

Куля, выпушчаная ў Марока неасьцярожнымі падлеткамі, трапляе ў амэрыканку, якая была з мужам на турыстычнай экскурсіі. Гэтая трагедыя выкліча падзеі ў Мэксыцы, Японіі і Злучаных Штатах. Сьвет — Бабілёнская вежа, дзе ўсе зьвязаныя адны з адным, не разумеюць адзін аднаго, але адзін на аднаго ўплываюць.

Глуханямая японка, якая ня можа перажыць самазабойства маці, мае зьвесткі пра мараканскую кулю, мэксыканская няня заблукае з амэрыканскімі дзеткамі, а афрыканскі падлетак стане ахвярай вайны з тэрарызмам.

Як і ў стужках «Сука-любоў» і «21 грам», Аляхандра Гансалес Іньярыту выкарыстоўвае свой фірмовы прыём скрыжаванага мантажу. Ён зьмешвае падзеі ў Марока, паездку няні з амэрыканскімі дзецьмі ў Мэксыку і пакуты ў японскім горадзе. Пры гэтым дзеі разгортваюцца не адначасова, а апераджаюць адна адну, адстаюць, спрабуюць дагнаць — што выклікае мітусьню, шум… і шок ад фатальнае зьнітаванасьці.

Для кожнага месца — свае жэсты й свая інтанацыя. Аўтызм індустрыйнай Японіі, сьпёка, прага, пыл — на афрыканскай зямлі, карнавальны гул Мэксыкі і пагоня на амэрыканскай мяжы.

Рэжысэр прымушае Кейт Бланшэт падоўгу ляжаць у крыві (што актрысе вельмі не спадабалася), зьдзірае з твару Брэда Піта галівудзкую маску — ягоны герой спакутаваны, стомлены й жывы.

Карціна агаломшвае сусьветным гоманам: мовы зьмешваюцца з гукамі пустыні й гарадзкімі шумамі.

Рэжысэр збудаваў Бабілёнскую вежу. Але цагліны гэтае вежы халадноватапрафэсійныя і ня вельмі злучаюцца між сабою.

Зь 1 сакавіка — сэансы ў менскіх кінатэатрах: «Аўрора», «Масква», «Кастрычнік».

**Андрэй Расінскі**




## ІМПРЭЗА

### Фінал конкурсу да стагодзьдзя «НН»

**6 сакавіка** ў Музэі Багдановіча, што ў Траецкім перадмесьці, будуць падведзеныя вынікі Конкурсу маладых літаратараў да стагодзьдзя «Нашай Нівы», які ладзіць Беларускі ПЭН-цэнтар. Фіналісты выступяць з сваімі творамі, скажуць Лявон Баршчэўскі, Андрэй Хадановіч, Ганна Кісьліцына, засьпявае Руся. **Пачатак а 18-й гадзіне.**

## СЭМІНАР

### Сэмінары па паліталёгіі

**3 і 10 сакавіка а 15-й гадзіне** ў памяшканьні ўправы БНФ адбудуцца сэмінары па паліталёгіі, якія ладзіць палітоляг Алесь Лагвінец.







## КІНО НА DVD

**Гавань** (Haven).
Драма, ЗША, 2006, рэж. **Фрэнк Е.Флаўэрз.**
У ролях: **Біл Пэкстан, Арланда Блум, Зоі Салдана.**
На Кайманавых выспах хаваюцца бізнэсоўцы і палюбоўнікі. Але трывогі дасягаюць і зацішнае гавані. Ці вытрымае каханьне падзеньне раю?
Менск, Кісялёва 12,
643-21-08




**...ляяльныя мастакі атрымалі замову намаляваць альтэрнатыўную Марачкіну карціну «Плошча».**

— А можа мяне трэба было ў параднай форме маляваць?

— Мне трэба толькі ваш твар. На карціне гэта будзе твар дэмакрата, які смокча заходнія гранты.

**...беларусы былі пацукамі.**

— Прынцып нашай дэмаграфічнай палітыкі просты. Нарадзіў 150 дзяцей — атрымай жылплошчу!






**...чаргінцоўскі «Маёр Ветраў» атрымаў Оскара.**

— А зараз пераможца ў намінацыі «Найлепшы фільм, зроблены па матывах твораў аўтараў, якія ня маюць права ўезду ў ЗША».

МАЛЮНКІ І ТЭКСТ ЛЁЛІКА УШКІНА

# Зьбяры «Кнігарню «Наша Ніва»




На тыдні выйшла: Жанчыны выходзяць з-пад кантролю. Беларускае жаночае апавяданьне




Андрэй Хадановіч. Сто лі100ў на tut.by




Пётра Рудкоўскі. Паўстаньне Беларусі




Андрэй Дынько, Андрэй Скурко. Беларусь за дзесяць падарожжаў

пытайцеся у кнігарнях і ў незалежных распаўсюднікаў

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**Гродна.** Жыды-выбаршчыкі падалі жалабу на няправільныя выбары. Мужыкі падалі таксама жалабу, пад каторай усе падпісаліся. Мужыкі просяць, каб адмяніць губэрнскія выбары дзеля таго, што яны былі абдурманены духоўнымі, каторыя ня ў пользу мужыкоў скарысталі зь іх шчырай хрысьціянскай веры, што «архірэй няпраўды ня скажа».

**«Наша Ніва». №8. 1907**

# А ты падпішыся!

**Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву»,**

проста паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас. Адначасова Рэдакцыя зьвяртаецца з просьбай ахвяраваць на выданьне. Дэталі — **старонка 17.**




## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАНЬНІ

**Віншую з днём нараджэньня** Юсупава Руслана (Сп.Б), жадаю здароўя, дабрабыту і посьпехаў на творчай ніве.

### КНІГІ

**Прапаную кнігі:** Ткачоў «Людзі і замкі», часопісы «Спадчына» 1989–1995, Л.Геніюш «Споведзь», Чарняўская «Архітэктура Віцебска», «Падручнік літоўскай мовы», «Этнаграфія Беларусаў», Гётэ «Фаўст», «Філяматы і філярэты», Баршчэўскі, Каліноўскі ды шмат іншага, усе напрамкі беларусістыкі. Т.: 8-029-753-70-05

### ПАДАРОЖЖА

**Зьміцер Касьяровіч** запрашае ў падарожжа 4 сакавіка (нядзеля) па маршруце Менск—Косава—Ружаны—Лыскава—Краскі—Падароск—Ізабэлін—Менск. 18 сакавіка: Іўе—Суботнікі—Жамыслаў—Трабы—Гальшаны—Баруны—Крэва. Т.: 292-54-58, 622-57-20, 509-12-16, 110-19-28, 573-88-17

### ПРАЦА

**Якасна выканаю** пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры, мове. Зьвяртацца загадзя. Т.: 101-03-24. Юрась.

**Якасны набор**, рэдагаваньне тэкстаў на беларускай мове. Зьвяртацца загадзя. Т.: 101-03-24. Юрась.

**Шаноўныя чытачы!**

У сувязі зь сьвяточным графікам працы друкарняў і паштовых аддзяленьняў 8 і 9 сакавіка, «Наша Ніва» выйдзе 7 сакавіка. Чытачы ў Менску атрымаюць яе ў сераду-пятніцу. За Менскам — найпазьней у панядзелак.

**Наша Ніва**
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).
сакратарка рэдакцыі Наста Бакшанская
шэф-рэдактар Андрэй Дынько
фотарэдактар Арцём Лява
галоўны рэдактар Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар Сяргей Харэўскі
заснавальнік Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша ніва»
выдавец Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**
© НАША НІВА.
Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102-71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.
Наклад 2241. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 28.02.2007.
Замова № 1201.
Рэдакцыйны адрас: Калектарная, 20а-112.